ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 18 (1447) | Серада, 2 сакавіка 1960 года | Цана 40 кап.

ПАРТЫЯ КЛІЧА

Набліжаецца вясна, другая вясна сямігодкі.

Вясна — гэта лугі ў красках, яркая зеляніна лесу і вясёлы птушыны звон, лёгкая бель садоў і маладая кволасць руні... Шмат хараства ў вясновым абуджэнні прыроды, яно заўсёды радуе, і чалавек у сваім імкненні да шчасця заўсёды жадае сабе жыцця прыгожага, як вясна.

Шлях да сапраўднага шчасця—шлях да камунізма. І савецкія людзі, пракладваючы гэты шлях, з кожным годам памнажаюць працоўныя здабыткі. Сямігадовы план, які цяпер здзяйсняе наш народ, з'явіцца важнай часткай вялікага шляху да камунізма. Другую вясну сямігодкі савецкія людзі сустракаюць з уздымам, з радасцю за дасягненні ў развіцці народнай гаспадаркі, дасягненні, якія робяць наша жыццё ўсё багацейшым і прыгажэйшым.

Нам ёсць чаму радавацца і чым ганарыцца. Мы маем сучасную, высакаразвітую прамысловасць, буйную механізаваную сельскую гаспадарку, перадавую культуру і навуку. Усё гэта створана за кароткі гістарычны тэрмін. І вось у 1959 г. у нашай краіне выпушчана толькі звыш плана прамысловай прадукцыі столькі, што яна перавышае ўсю вытворчасць прамысловасці даэвалюцыйнай Расіі. У сельскай гаспадарцы СССР цяпер працуе больш чым мільён 700 тысяч трактараў. Савецкія касмічныя ракеты прадэманстравалі ўсяму свету поспехі нашай навукі і тэхнікі. У нас амаль у два разы больш інжынераў, чым у ЗША; у савецкіх вышэйшых навучальных установах амаль у чатыры разы больш займаецца студэнтаў, чым у такіх еўрапейскіх краінах, як Англія, Францыя, Заходняя Германія і Італія, разам узятых...

Можна было б прадоўжыць гэтыя красамоўныя факты, што сведчаць аб шпаркай і ўпэўненай хадзе нашага народа наперад, у будучыню.

Як тут не прыгадаць словы Маякоўскага, які назваў Савецкую краіну вясной чалавецтва!..

Так, грандыёзныя справы здзейсніў наш народ. Таму цвёрда ўпэўнены ён у сваёй будучыні, у тым, што план пабудовы камунізма ў нашай краіне будзе паспяхова ажыццёўлены. Гэтая ўпэўненасць памнажае сілы, нараджае працоўны энтузіязм і радасць.

— Датэрмінова выканаем сямігадовы план! — гавораць савецкія людзі.

На заводах і будоўлях, у калгасах і саўгасах, усюды шырыцца рух ударнікаў і калектываў камуністычнай працы.

Як і ва ўсёй Савецкай краіне, вялікі палітычны і працоўны ўздым пануе ў гарадах і вёсках нашай рэспублікі. XXIV з'езд Камуністычнай партыі Беларусі прадэманстраваў адзінства і рашучасць беларускага народа натхнёнай працай змагацца за новыя перамогі камуністычнага будаўніцтва. Рэзалюцыя з'езду па справаздачы Цэнтральнага Камітэта КПБ вызначае канкрэтныя задачы па ажыццяўленню рашэнняў XXI з'езду КПСС і сацыялістычных абавязацельстваў працоўных рэспублікі па датэрміновому выкананню заданняў сямігодкі. На аснове глыбокага аналізу стану прамысловасці, сельскай гаспадаркі, ідэалагічнай работы ў Рэзалюцыі XXIV з'езду КПБ адзначаны недахопы, якія неабходна пераадолець, каб паспяхова ісці наперад.

Як вядома, XXIV з'езд КПБ удзяліў шмат увагі развіццю культуры ў рэспубліцы. Гэта знайшло шырокае адлюстраванне і ў Рэзалюцыі з'езду па справаздачы ЦК КПБ.

Работнікі культурна-асветных устаноў, дзеячы літаратуры і мастацтва рэспублікі імкнуцца актыўна ўдзельнічаць у жыцці, у выкананні сямігодкі. У нас ёсць узорныя па пастаноўцы работы клубы, дамы культуры, бібліятэкі. Нашы пісьменнікі, мастакі, кампазітары, артысты стварылі цікавыя творы аб сучаснасці.

Аднак зробленага недастаткова. У дзейнасці нашых творчых арганізацый і ў рабоце культурна-асветных устаноў шмат яшчэ недахопаў. У Рэзалюцыі XXIV з'езду гаворыцца:

«Партыйныя і савецкія органы на месцах, Міністэрства культуры і Белсавпроф не прымаюць неабходных мер да паляпшэння работы культасветустаноў, нездавальняюча арганізуюць будаўніцтва і добраўпарадкаванне клубаў і бібліятэк, падрыхтоўку кадраў культасветработнікаў, недастаткова выкарыстоўваюць клубныя ўстановы ў справе камуністычнага выхавання працоўных.

Творчыя арганізацыі рэспублікі недастаткова змагаюцца за стварэнне высокамастацкіх твораў літаратуры і мастацтва, асабліва на сучасныя тэмы. Па-ранейшаму дрэнна абстаіць справа са стварэннем добрых п'ес і кінасцэнарыяў. У вялікім даўгу перад народам знаходзяцца мастакі, кампазітары, работнікі тэатраў, кіно і музычных калектываў. Міністэрства культуры БССР слаба кіруе творчымі калектывамі, дапускае памылкі ў падборы кадраў, мірыцца з пранікненнем на сцэну халтуры, мала клапоціцца аб стварэнні нацыянальнага рэпертуару».

Ліквідаваць гэтыя недахопы — справа гонару працаўнікоў культурнага фронта рэспублікі!

XXIV з'езд КПБ патрабаваў павысіць ролю культасветустаноў у камуністычным выхаванні працоўных, забяспечыць, каб клубныя ўстановы на справе сталі апорнымі базамі партарганізацый у ідэалагічнай рабоце сярод насельніцтва. Неабходна, каб у бліжэйшыя гады добраўпарадкаваныя клубы і бібліятэкі былі на кожным буйным прадпрыемстве, у кожным калгасе і саўгасе.

«З'езд, — гаворыцца ў Рэзалюцыі па справаздачы Цэнтральнага Камітэта КПБ, — абавязвае партыйныя камітэты, Міністэрства культуры БССР павысіць узровень кіраўніцтва творчымі калектывамі, пастаянна расшыраць і ўмацоўваць іх сувязі з народам, праяўляць больш клопатаў аб павышэнні ідэйнай загартоўкі і прафесіянальнага майстэрства творчай інтэлігенцыі. Абавязак пісьменнікаў, журналістаў, мастакоў, кампазітараў, работнікаў кіно і тэатральнага мастацтва рэспублікі — больш актыўна ўдзельнічаць у камуністычным выхаванні працоўных, ствараць новыя яркія творы аб савецкіх людзях — будаўніках камунізма».

Гэта пачэсныя і адказныя задачы. Чым лепш мы з імі справімся, тым большы будзе наш уклад ва ўсенародную справу камуністычнага будаўніцтва.

Сённяшняе жыццё народа, яго гераічная праца — вось дзе трэба чэрпаць тэмы і вобразы для твораў літаратуры і мастацтва, вось дзе жыватворная крыніца высокага натхнення! Наш народ, які стварыў і творыць цуды на сваёй зямлі, дастойны вялікай літаратуры, вялікага мастацтва!

Няма сумнення ў тым, што працоўныя Беларусі, як і ўсяго Савецкага Саюза, дасягнуць выдатных поспехаў і ў другім годзе сямігодкі, які пачаўся цудоўнымі справамі. Рабочы клас Беларусі з месяца ў месяц нарошчвае тэмпы працы, нашы прадпрыемствы выпускаюць больш і больш прамысловай прадукцыі. Працаўнікі сацыялістычнай вёскі рыхтуюцца дастойна сустрэць вясну, каб закласці трывалую аснову ўраджаю, багатага ўраджаю. Гэта будзе вясна высокай агратэхнікі, вясна нябачанага размаху сацыялістычнага спаборніцтва за далейшы ўздым усіх галін сельскай гаспадаркі.

Партыя кліча і вядзе да новых поспехаў!

Плённай працы, цудоўных здабыткаў чакае беларускі народ і ад сваіх дзеячоў літаратуры і мастацтва.

Свежы голас

Адбылося чарговае пасяджэнне секцыі паэзіі, на якім былі абмеркаваны вершы маладога паэта Валянціна Лукшы, кантрольнага майстра УНР-124 трэста «Нафтабуд».

Анатоль Вялюгін адзначыў, што ў маладога аўтара ёсць сваё бачанне свету, але пакуль што многім вершам не стае мастацкай завершанасці. Паэту трэба больш працаваць над удасканаленнем твораў, рыхтаваць кніжку аб нараджэнні новага горада.

Артур Вольскі адзначыў тыя ж недахопы, раіў В. Лукшу больш звяртаць увагі на вобразнасць мовы, на стварэнне вобраза лірычнага героя.

Аб неабходнасці лепш прадумваць творы, узнімацца да мастацкіх абагульненняў, а не фатаграфаваць паасобныя моманты, эпізоды, паўней выкарыстоўваць у вершах матэрыял са сваёй багатай працоўнай біяграфіі гаварылі В. Лукшу Пятрусь Макаль і Навум Кіслік.

Сяргей Грахоўскі раіў аўтару не ўганяць вершы ў кароткую форму, больш шліфаваць кожны радок, глыбей асэнсоўваць жыццёвыя з'явы. Пры ўдумлівай працы над багатым фактычным матэрыялам, які ў яго ёсць, малады паэт здолее выдаць цікавую, змястоўную кніжку.

Секцыя рэкамендавала Валянціну Лукшу дапрацаваць вершы, каб у хуткім часе можна было здаць яго першы зборнік у Дзяржаўнае выдавецтва БССР.

Валянцін Лукша згадзіўся з выказанымі заўвагамі.

Абмеркаванне аповесці

Днямі Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР правёў дыспут па аповесці Янкі Брыля «Апошняя сустрэча».

Удзельнікі дыспута адзначылі, што новая аповесць пісьменніка — значны крок у яго творчасці. Думкамі аб творы падзяліліся Д. Бугаёў, Ан. Клышко, А. Адамовіч, В. Каваленка, В. Івашын, Ю. Пшыркоў і іншыя.

Ул. СОДЭЛЬ.

ДА 90-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ УЛ. І. ЛЕНІНА

НЕЗАБЫЎНАЕ

Сцюдзёны лютаўскі вечар...

За вокнамі гудзе завіруха. Сухі, калючы снег са звонам б'ецца ў шыбы, сівым халодным дымам клубіцца над белымі дахамі пасёлка. Жаласна, бы галоднае шчанё, скуголіць вецер, шастае па голых садах і, нідзе не знайшоўшы прытулку, ляціць далей, у палі, на лабавіны ўзгоркаў.

Навум Гаўрылавіч Кавалёў, чалавек год пад шэсцьдзесят пяць, сутулаваты, шырокі ў плячах, сядзіць за сталом і праз заплаканае шкло акна задуменна глядзіць на вуліцу. Ён зусім забыўся, што рабочы дзень скончыўся, што пара ісці дамоў, што яго чакаюць і будуць дакараць: маўляў, зусім «адбіўся ад рук», не выконваеш парад урача, замест таго, каб больш часу праводзіць на вольным паветры, цэлыя дні і вечары сядзіш у маленькім пакойчыку, у густым тытунёвым дыме...

Усё гэта праўда, усё гэта так. Але што зробіш? Кожны дзень прыходзяць людзі, многа людзей. Наведваюцца свае, мясцовыя і чужыя, зусім незнаёмыя, з ліку тых, што прыехалі здалёк, каб пагутарыць са старым камуністам, які некалі бачыў Леніна, гутарыў з Леніным, ахоўваў яго жыццё.

А сёння вось з'явіўся карэспандэнт абласной газеты і папрасіў расказаць чытачам аб сабе, аб сваіх сустрэчах з вялікім правадыром рабочага класа.

— Толькі, калі ласка, напішыце ўсё проста і коратка,—сказаў на развітанне карэспандэнт.

Проста і коратка...

А як можна расказаць проста і коратка пра тое, што з'яўляецца зместам усяго жыцця? З чаго пачаць? Якія факты будуць самымі цікавымі для тысяч чытачоў?

Навум Гаўрылавіч адшукаў сярод папер партсігар, закурыў.

За акном гудзе завіруха.

Вось такой жа была і тая лютаўская ноч васемнаццатага года, ноч перад яго ад'ездам у Маскву...

Такая ноч...

А можа з яе і пачаць свой расказ? З таго апошняга бою? Гэта ж тая ноч і той бой прывялі яго ў Маскву, у Крэмль, на курсы чырвоных камандзіраў.

Кавалёў глыбока зацягнуўся папяросай, разгарнуў сшытак, задумаўся.

Тая ноч... Завіруха... Мароз...

Батальён узняты па трывозе. Разведка толькі што данесла, што інтэрвенты і белагвардзейцы рыхтуюцца нанесці нечаканы ўдар па 97 Саратаўскім палку, які яшчэ не паспеў умацавацца на новых пазіцыях.

Камандзір батальёна, худы чалавек у дзіравым салдацкім шынялі, чытае баявы загад. Шалёны вецер хапае яго словы прама з вуснаў і кідае ў ноч, у белую кіпень. Чырвонаармейцы не чуюць таго, што гаворыць ім камандзір, але разумеюць, чаго ён ад іх хоча. Наступае люты вораг, і яго трэба спыніць, затрымаць, даць магчымасць галоўным сілам палка арганізаваць абарону. Вораг не павінен прайсці!

Хрыплы голас каманды і... лес паглынае батальён. Гнуцца і стогнуць над галовамі людзей старыя, чорныя яліны, абледзянелае голле да крыві разрывае твары і рукі, а людзі ідуць, ідуць наўпрост, па глыбокім снезе. Дзесьці за лесам — станцыя Емец, далей — Архангельск. Сёння яны ў руках інтэрвентаў і белагвардзейцаў, але заўтра будуць у нашых руках. Толькі трэба спыніць ворага тут, на гэтых лясных сцежках. Інакрыві рэвалюцыю, ды захлынуліся самі ва ўласнай крыві? Можа, проста пачаць з той мінуты, калі перад салдатам Кавалёвым адчыніліся Троіцкія вароты Крамля?

Не, многае будзе незразумелым для чытача. Лепш, мусіць, пачаць так...

... Гэта раніца была надзвычай прыгожая. Зацярушаныя снегам, соладка драмалі яліны. На страхах старэнькіх хат раставаў снег. Сагрэтыя сонцам, шалелі на сметніках вераб'і. На ўзлессі плялі свае плёткі гарластыя сарокі.

Кулямётны ўзвод, якім камандаваў Кавалёў ва ўчарашнім баі, адпачываў. Людзі чысцілі зброю. Размясціўшыся на заваліне, Кавалёў і яго памочнік Васіль, ці, як яго звалі чырвонаармейцы, Васька-хахол, правяралі кулямёты. Адзін з «Максімаў» быў пашкоджаны гранатай, і сябры раіліся, як яго адрамантаваць. У гэты час і з'явіўся сувязны са штаба палка.

— Хутчэй у штаб! — сказаў ён Кавалёву, не злазячы з каня. — І памочніка свайго вядзіце туды. Камісар выклікае.

Сябры неспакойна пераглянуліся. Што такое здарылася? Навошта яны спатрэбіліся камісару?

— Не ведаеш, што яму ад нас трэба? — не сцярпеў Васіль.

— Не ведаю. Прыйдзеце — пачуеце.

Васіль пачухаў за вухам, раздражнёна махнуў рукой:

— Нешта выдумаў! Ці галаву мыліць будзе, ці зноў у нейкае пекла пашле.

— Здаецца, нічога такога мы і не зрабілі, каб нам галаву мыліць, — няўпэўнена адазваўся Кавалёў, паспешна збіраючы разабраны кулямёт. —Наадварот, кажуць, што сам Ленін прыслаў у штаб тэлеграму і віншуе полк з перамогай над інтэрвентамі.

— Ой, чуе мая душа нешта такое! — уздыхнуў Васіль.

Прадчуванне Васіля спраўдзілася. Камісар палка паведаміў сябрам таварыш ён пойдзе далей, захопіць другія гарады і сёлы, станцыі і хутары.



Ул. І. ЛЕНІН У ГОРКАХ (1922 г.). Фотахроніка БЕЛТА. (Архіў ІМЛ).

І людзі ў дзіравых шынялях, амаль босыя, галодныя спяшаюцца насустрач ворагу.

А вось і ён, вораг. Вось яны тыя, хто рашыў задушыць рэвалюцыю, патапіць у крыві і слязах самую светлую мару чалавека.

Вялікі атрад англічан і белых афіцэраў размясціўся на ўзлессі. Пад старымі ялінамі палаюць кастры. Развешаныя на суччах, цьмяна паблісквае вінтоўкі, карабіны, ручныя кулямёты.

Вораг спакойны, снедае, адпачывае. Вораг ведае, што чырвоныя далёка, што чырвоныя змучаны няспынныя баямі і голадам. Хіба рызыкнуць яны, апранутыя ў рыззё, выйсці ў паход у такую шалёную ноч, каб адшукаць іх, англічан, тут, ля кастроў, за багатым снеданнем?..

Навум Гаўрылавіч прыпаліў новую папяросу, нахмурыў сівыя бровы. А ці варта ўсё гэта пісаць, ці варта расказваць тое, што было сорак два гады назад? Ці варта апісваць жорсткі бой, у якім лягло нямала заморскіх ваяк, што хацелі патапіць у кое, што колькі мінут яны стаялі, нібы аглушаныя.

— К-куды ехаць? — нарэшце перапытаў Васіль, недаверліва пазіраючы ў вочы камісару.

— У Маскву,—паўтарыў той. — Па загаду Леніна адкрыты курсы чырвоных камандзіраў-кулямётчыкаў. Я параіўся з камандзірам палка, з вашым батальённым, і вырашылі паслаць вас. Так што збірайцеся ў дарогу. І памятайце, хлопцы: вы ў адказе за чэсць усяго палка. Вы ж будзеце жыць у Крамлі і амаль кожны дзень будзеце на вачах у самога Леніна.

...У Маскве ўжо бушавала вясна, калі сябры дабраліся туды з далёкага Паўночнага фронта. Старанна пагаліліся на вакзале, наваксавалі боты і падаліся да Крамля, дзе, як сказалі ім у камендатуры, размешчана курсанцкая рота кулямётчыкаў.

Апынуўшыся ў Крамлі, абодва неяк спалохана пераглянуліся і пайшлі паўз палацы асцярожна, нібы пад іх нагамі ляжаў тонкі лёд, які можа вось-вось праваліцца.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

РЭСПУБЛІКАНСКІ АГЛЯД МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ КАЛГАСАЎ І САЎГАСАЎ

ЯРКАЕ І САМАБЫТНАЕ МАСТАЦТВА

Вось яно, непаўторна яркае і самабытнае мастацтва народных мас ва ўсёй сваёй прыгажосці і велічы! Такое мастацтва кранае душу сваёй прастатой і шчырасцю, глыбінёй жыццёвай праўды.

Радаснае і хвалюючае пачуццё ні на хвіліну не пакідала мінчан, калі яны слухалі цудоўныя напевы наднёманскай стараны і багатага палескага краю або з задавальненнем глядзелі вясёлыя, імклівыя танцы віцяблян. Гледачы з захапленнем прымалі амаль кожны нумар праграмы. Ды і хіба магчыма было не захапляцца цудоўным, поўным адухоўленай прыгажосці і прывабнасці акапельным спяваннем харавых капел калгаса «Сцяг Саветаў» Навагрудскага раёна (мастацкі кіраўнік П. Радаліцкі) і саўгаса «Бярозкі» з Гомельшчыны (мастацкі кіраўнік А. Лукомскі). Гэтыя два самадзейныя акадэмічныя калектывы, якія дасягнулі такога высокага ўзроўню выканаўчага майстэрства і пеўчай культуры, бадай, не ўступяць многім прафесіянальным хорам. Вось у каго варта вучыцца ўменню чыста, выразна спяваць складаныя творы нацыянальнага і класічнага рэпертуару.

Сярод пеўчых калектываў народнага характару вылучаюцца хоры калгаса «Новае жыццё» Карэліцкага раёна, саўгаса «Арэса» Акцябрскага раёна і калгаса імя Леніна Брагінскага раёна. Сельскія спевакі з Брагіншчыны самі склалі вельмі тапныя жартоўныя частушкі аб двух калгасах. Дарэчы, схільнасцямі да стварэння свайго рэпертуару валодаюць і іншыя самадзейныя артысты. Пры гэтым яны часцей за ўсё кіруюцца палымяным імкненнем—уславіць працоўныя подзвігі звенняў або брыгад, адлюстраваць у песні росквіт роднага калгаса. Так, перадавое ільнаводчае звяно калгаса «Зара камунізма» Навагрудскага раёна натхнёна выканала ўласную песню «У паняздзелак чуць святочак», а жаночы квінтэт сельгасарцелі «Шлях да камунізма» Дубровенскага раёна — свае задорныя калгасныя прыпеўкі, прасякнутыя непаўторным народным гумарам.

Ансамбль песні і танца сельгасарцелі імя Сталіна Гомельскага раёна (кіраўнік І. Пузыроў) у сваіх творчых пошуках і імкненнях пайшоў яшчэ далей, стварыўшы цэлую літаратурна-музычную кампазіцыю з танцамі. Гэта — надзённы, пабудаваны на жывым канкрэтным матэрыяле расказ (няхай нават з элементамі плакатнасці) пра тое, як багата жывуць і слаўна працуюць цудоўныя людзі ў адным з праслаўленых гомельскіх калгасаў-мільянераў, як яны вырошчваюць нябачаныя ўраджаі кукурузы.

І пяе, пяе душа —
Сталі мы багатыя.
Кукуруза у калгасе
Сеяна квадратамі, —

задорна спяваюць стваральнікі гэтай кампазіцыі, расказваючы ў частушках пра саміх сябе, пра шчаслівае жыццё тых, хто працуе ў калектыўнай гаспадарцы і множыць багацце Радзімы.

Відаць, што ўдзельнікі ансамбля добра папрацавалі над кампазіцыяй (асабліва цікава пастаўлены танец «Кукуруза»). Аднак у літаратурным тэксце нямала слабых месц і недапрацовак, а музыка некаторых песень паўтарае ўжо вядомыя матывы і сям-там не вызначаецца самастойнасцю. Ліквідаваць гэтыя недахопы павінны дапамагчы растучаму маладому калектыву метадысты абласнога Дома народнай творчасці, якія раней ставіліся вельмі пасіўна да мастацкай задумы аматараў прыгараднага калгаса.

Канцэртныя праграмы калгаснасаўгаснай самадзейнасці Гродзенскай і Гомельскай абласцей на аглядзе былі насычаны мноствам нумароў самых розных жанраў. Громам апладысментаў сустрэлі гледачы знаёмы яшчэ па Дэкадзе самадзейнага мастацтва надзвычай арыгінальны вакальны квінтэт калгаса «Новае жыццё» Карэліцкага раёна. Выкананне пажылымі сельскімі спевакамі старадаўніх беларускіх жартоўных песень «Забалела ды мая галоўнька» і «Чачотачка» было афарбавана сапраўдным народным каларытам.

У такім жа народным стылі, з уласцівым яму тонкім гумарам і непасрэднасцю, прагучалі ў канцэрце гамяльчан частушкі «Сачавіца з вікаю» ў выкананні жаночага ансамбля калгаса «Бальшавіцкая перамога» Хойніцкага раёна.

У інструментальным жанры парадавалі майстэрствам балалаечны квінтэт братоў Лубковых (конзавод № 59 Гомельскага раёна) і аркестр народных інструментаў калгаса імя Жданава Калінкавіцкага раёна, які добра справіўся з выкананнем двух твораў нацыянальнага рэпертуару.

Але, бадай, найбольш вырасла мастацтва інструментальнай музыкі ў Віцебскай вобласці, якое як і танцавальны жанр, здаўна тут шырока бытуе і славіцца. Гэта было прыкметна хоць бы па выступленнях каларытнага і яркага цымбальнага аркестра калгаса «70 год Сталіна» Пастаўскага раёна і ансамбля баяністаў Лепельшчыны, які вызначаецца добрай сыгранасцю і правільнай трактоўкай музычных твораў.

Нарэшце, ад той жа Віцебскай вобласці ўдала дэбютаваў на аглядзе зводны цымбальны аркестр удзельнікаў самадзейнасці саўгаса «Стайкі» Гарадоцкага раёна, калгасаў «Шлях сацыялізма» Сенненскага раёна і «Іскра» Лёзненскага раёна. Праўда, варта сказаць, што падобная практыка аб'яднання самадзейных музыкантаў з розных калгасаў (і больш таго, з розных раёнаў) не заўсёды пажаданая, таму што цяпер трэба імкнуцца да стварэння асобных творчых калектываў, у тым ліку і аркестраў, у кожнай буйнай сельгасарцелі. Аднак у дадзеным выпадку арганізацыя гэтага зводнага музычнага калектыву апраўдана тым, што яго ўдзельнікі, авалодваючы пад кіраўніцтвам вопытнага дырыжора Я. Нікіціна тэхнікай ігры на цымбалах і выпрацоўваючы ансамблевасць, змогуць хутка стаць творчым ядром асобных калгасных аркестраў.

Агляд паказаў значнае адставанне на Віцебшчыне пеўчай культуры. Гэтая вобласць не здолела прадставіць на агляд такіх яркіх і самабытных харавых калектываў, якія, напрыклад, прывезлі ў сталіцу гродзенцы або гамяльчане. Між тым, у Аршанскім і Бешанковіцкім раёнах ёсць даволі цікавыя харавыя калектывы, але яны па невядомых прычынах не трапілі на рэспубліканскі агляд. Кіраўнікам Віцебскага Дома народнай творчасці варта больш аддаваць увагі развіццю харавой культуры ў вобласці.

Затое канцэрт віцяблян быў добра афармлены, касцюмы сельскіх артыстаў вытрыманы ў беларускім стылі. У гамяльчан таксама касцюмы былі вельмі прыгожыя, але, на жаль, пазбаўленыя сапраўднага нацыянальнага каларыту.

У перадапошні раз заслона агляду народных талентаў калгаснай вёскі апусцілася на справаздачным канцэрце самадзейнасці Брэсцкай вобласці. Таленавітыя спевакі, чытальнікі, інструменталісты Брэстчыны завяршылі вялікую праграму тыднёвага творчага спаборніцтва сельскіх аматараў мастацтва. Яны таксама не адсталі ад іншых абласцей і ў любоўным, удумлівым афармленні свайго канцэрта, і ў падборы для яго мастацкіх нумароў. Вядома, былі некаторыя і слабыя, непрадуманыя выступленні, але не яны вырашалі поспех канцэрта ўвогуле.

Мы пераканаліся, што на брэсцкай зямлі працягваюць жыць і развіваюцца здаўна існуючыя багатыя пеўчыя традыцыі. Гэта можна было заўважыць па выступленнях народнага хору калгаса імя Леніна Ляхавіцкага раёна, акапельнага хору калгаса імя Сталіна Брэсцкага раёна і жаночага харавога калектыву саўгаса імя Варашылава Бярозаўскага раёна. Кожнаму з іх уласцівы свая выканаўчая манера, рысы творчай індывідуальнасці і асабліва любоў да нацыянальнага рэпертуару. Добрае ўражанне пакідае спяванне настаўніка Радзежскай сямігадовай школы В. Ладзейнава (Маларыцкі раён), а таксама мастацкае чытанне А. Маліноўскага.

Пасля прагляду калгасна-саўгаснай самадзейнасці ўсіх абласцей Беларусі і сакавіка ў Тэатры оперы і балету быў дадзены для грамадскасці сталіцы вялікі заключны канцэрт пры ўдзеле лепшых сіл народнага мастацтва сацыялістычнай вёскі. І як не прыгадаць тут словы сучаснай беларускай народнай песні, што прагучала ў адным з канцэртаў агляду і з'яўляецца яго своеасаблівым рэфрэнам:

Роднай партыі пяём
Дзякуй шчырае,
Што сягоння мы жывём
Усе шчаслівыя.

Так, шчасце і багацце назаўсёды ўвайшлі ў дом калгаснікаў, і таму іх песні, поўныя гарачай любві да Камуністычнай партыі, гучаць шчыра, ад усёй душы, на ўвесь свет!..

Г. ЗАГАРОДНІ.

Фота **Ул. Крука.**

На здымку: песню «Вясна зарэчная» выконваюць удзельнікі мастацкай самадзейнасці **Е. Дзямешчык і А. Сядач** з калгаса «Новы шлях» Мастоўскага раёна.

На здымках: 1. Ільнаводчае звяно калгаса «Зара камунізма» Навагрудскага раёна—выканаўца беларускіх народных песень. 2. Беларускі народны танец «Малацілачка» выконвае танцавальны калектыў калгаса «Чырвоная Беларусь» Аршанскага раёна.

НЕЗАБЫЎНАЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Нечакана Васіль спыніўся і аж рот разявіў ад здзіўлення.

— Што з табой? — занепакоіўся Кавалёў.

— Ды ты толькі зірні! — весела, забыўшыся пра нядаўні незразумелы страх, усклікнуў Васіль. — Вось гэта гармата! Га? Ды распярунь яе пярун! Вось бы такую нам на фронт! Як бабахнуў раз, дык палка белякоў як і не было!..

Сябры добрых мінут дзесяць стаялі ля Цар-пушкі, здзіўляючыся, чаму яе не накіруюць на фронт, дзе так не хапае гармат, нарэшце схамяналіся, успомніўшы, што яны павінны ісці шукаць сваю роту.

Па дарозе, азірнуўшыся па баках, Васіль асцярожна спытаў:

— Слухай, Навум, а калі зараз нам насустрач трапіцца Ленін!.. Што ты будзеш рабіць?

— Я? — перапытаў Кавалёў. — А што ж тут рабіць? Казырну, рубану страявым, і ўсё тут!

— А ты... ты пазнаеш Леніна?

— Ха! Вось дзівак! Хто ж Леніна не пазнае? Ды я яго за вярсту пазнаю!

... Кавалёў расцёр у папяльніцы недакурак, зірнуў на партрэт Ільіча, што вісеў на сцяне, насупраць яго, усміхнуўся. Не, не! Так пачынаць расказ не варта! Усё нічога, але вось гэтыя словы: «за вярсту пазнаю!» Эх, Навум, рана ты пахваліўся! «За вярсту»! А што на справе атрымалася?

Роўна праз два тыдні рота, у якой вучыліся Кавалёў і яго сябра, пайшла ў нарад. Кавалёў трапіў у лік вартавых, што ахоўвалі кватэру Леніна.

Як калацілася сэрца курсанта, калі ён паднімаўся на другі паверх, падыходзіў да запаветных дзвярэй!

— Ільіч дома?—ціха спытаў ён у вартавога, якога змяняў.

— Выйшаў,—шапнуў той у адказ.

Паляцелі гадзіна за гадзінай. Заходзілі розныя людзі, паказвалі пропускі. Даўно прыйшла Надзежда Канстанцінаўна, вярнулася з працы сястра Ільіча, а Леніна ўсё не было.

Заставалася з паўгадзіны да змены. Ад напружання вочы пачалі слязіцца. «Так і не ўбачу!» — нарэшце ўздыхнуў салдат і тут убачыў на лесвіцы невысокага чалавека ў зімовай шапцы з аксамітным верхам. Чалавек ішоў шпарка і хмурыў лоб.

Кавалёў быў упэўнены, што Ільіч прыедзе на ліфце, а таму не звярнуў асаблівай увагі на гэтага чалавека, што спрытна, з лёгкасцю юнака, перабіраў нагамі мармуровыя ступенькі. А калі чалавек накіраваўся да дзвярэй ленінскай кватэры, Кавалёў незадаволена загадаў:

— Пропуск!

— А, даруйце, — схамянуўся чалавек.—Вось мой пропуск.

Кавалёў зірнуў у паперку і раптам адчуў, што ўся яго кроў хлынула ў твар і галаву.

— Хіба што не так? — заўважыўшы разгубленасць салдата, занепакоіўся чалавек.

— Праходзьце, таварыш Ленін!— на ўвесь калідор крыкнуў Кавалёў, выцягваючыся ў струнку.

Ільіч усміхнуўся аднымі вачыма і той жа лёгкай хадой юнака знік за дзвярыма. А Кавалёў? Ён нават дрэнна памятаў, як змяніўся з паста. А калі вярнуўся ў каравульнае памяшканне, сябры сустрэлі яго выбухам смеху. Аказваецца, усе ўжо ведалі, як Кавалёў сустрэў Уладзіміра Ільіча. Асабліва смяяўся сябра, Васіль.

— Ну як, браток, за вярсту пазнаў Леніна?! — рагатаў ён.

Кавалёў чырванеў і маўчаў. Праўда, начальнік каравула ад імя Леніна аб'явіў яму падзяку за добрую службу, але...

Не, аб гэтым выпадку, мусіць, лепш не расказваць. Ці не лепш расказаць пра тое, як ён першы раз слухаў Леніна, гутарыў з ім.

Гэта здарылася неўзабаве пасля першага знаёмства з Ільічом. Зусім нечакана, нікога не папярэдзіўшы, Ленін з'явіўся ў курсанцкай сталовай і, спыніўшыся каля стала, за якім сядзелі Кавалёў і яго сябра Васіль, спытаў:

— Як кормяць?

Пабоўтаўшы лыжкай суп у талерцы, Кавалёў уздыхнуў:

— Не вельмі што...

Ленін зазначыў:

— Але будзе лепш! Будзе! Вось разаб'ём белякоў і інтэрвентаў і будзем есці лепшыя супы.

Пачуўшы скаргу, што не хапае курыва, тут жа загадаў выдаць курсантам папярос.

Наогул, Ленін любіў бываць сярод курсантаў. Вечарамі, калі канчаліся заняткі і курсанты збіраліся на валейбольнай пляцоўцы, часта з'яўляўся туды і Ленін. Садзіўся збоку, на лавачцы, і назіраў весела падбадзёрваючы валейбалістаў, многіх з якіх ведаў па прозвішчах.

Можна расказаць і яшчэ пра адну сустрэчу з Ільічом.

У Андрэеўскай зале сабраліся камуністы на партыйны сход. Сярод іх — многа курсантаў. Усе чакаюць Леніна. А пакуль ажыўлена размаўляюць, раздзяліўшыся на невялікія групкі. У цэнтры адной з такіх груп —Васіль-хахол, нястомны весялун. Ён так захапіўся, расказваючы нейкую неверагодную гісторыю, што і не прыкмеціў, калі падыйшоў Ленін. А Ленін стаяў ужо мінут пяць і, весела жмурачы вочы, слухаў.

— Няўжо ўсё так было? — раптам, дакрануўшыся да пляча расказчыка, спытаў ён.

— Не верыш? Ты не...—Васіль раптам папярхнуўся і нырнуў у натоўп. Усе засмяяліся, а званчэй усіх смяяўся Уладзімір Ільіч і нават папрасіў, каб яго пазнаёмілі з вясёлым курсантам.

Пачаўся сход. Кавалёў, каб лепш пачуць, аб чым будзе гаварыць Ленін, падыйшоў да прыадчыненых дзвярэй адной з ложаў і спыніўся, прыслухоўваючыся.

— Таварыш курсант, — раптам пачуўся ціхі жаночы голас. — Праходзьце і сядайце. Вось свабоднае месца.

Кавалёў уздрыгнуў і сумеўся. На яго з ложы глядзела Надзежда Канстанцінаўна Крупская.

— Праходзьце, праходзьце! — настойліва паўтарыла яна.

На гэтым сходзе выступіў Ленін. Ён гаварыў аб тым, што ў горадзе няма хлеба, што трэба ўмацоўваць фронт, аднаўляць разбураную гаспадарку. Кавалёў лавіў кожнае слова, і паступова перад ім складваўся малюнак сучаснага жыцця краіны, краіны разбуранай, галоднай, залітай крывёю, і малюнак жыцця будучага, поўнага святла і радасці. Ленін гаварыў аб новых заводах і фабрыках. І ён, салдат Кавалёў, бачыў іх перад сабою ў залатых агнях электрычнасці, напоўненых гулам станкоў.

Так, аб гэтай сустрэчы з Леніным варта расказаць.

А, можа, расказаць пра апошнюю сустрэчу з Ільічом, пра той майскі дзень 1920 года, калі ён, Ленін, праводзіў на фронт былых курсантаў, што сталі камандзірамі Чырвонай Арміі? Перадаць тое, як мы ўспрынялі яго палкую прамову, у кожным слове якой адчувалася вялікая вера ў хуткую перамогу над ворагамі, вера ў вялікую будучыню Савецкай краіны?

Трэба падумаць. Трэба добра падумаць. Цяжка ў сціслым расказе перадаць тое, што складае змест усяго твайго жыцця...

Алесь ШАШКОЎ.

п. Варапаева,
Віцебская вобласць.

Мікола ГАНЧАРОЎ.

БРАНЯВІК

Яго ў агні
Рабочыя кавалі.
Стаіць сталёвы,
Горды ён
З тых пор.
Іх мускулы
Яго бранёю сталі.
Іх сэрцаў жар
У сябе ўвабраў
Матор.
Хоць тыя годы
Адыйшлі у даўнасць —
Хоць не раўня ён
Танкам баявым,
Ды сам Кастрычнік
З перамогай слаўнай
У новае жыццё
Увайшоў на ім!

Пераклад з рускай мовы
А. СТАВЕРА.

Да знамянальнай даты

Працоўныя Старобінскага раёна рыхтуюцца шырока адзначыць 90-годдзе з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. У дамах культуры, сельскіх клубах, бібліятэках, хатах-чытальнях, у школах арганізаваны выстаўкі твораў Ільіча, фотавітрыны і мантажы, у якіх расказваецца аб жыцці і рэвалюцыйнай дзейнасці вялікага правадыра чалавецтва.

У гэтыя дні на сельскіх экранах дэманструюцца кінафільмы «Па пуцёўцы Леніна», «Віхры варожыя», «Ул. І. Ленін у першыя гады Савецкай улады», «Чалавек з ружжом» і іншыя. Такія фільмы ўжо дэманстраваліся ў кінатэатры райцэнтра, у клубе будаўнікоў Салігорскага калійнага камбіната, у радзе калгасаў.

П. Бародка.

З агляду калгасна-саўгаснай самадзейнасці

Кіраўнік хору калгаса імя Леніна Брагінскага раёна **Я. Шайкевіч.**

Сяброўскі шарж **Л. Чурко.**

На здымку: жартоўныя частушкі «Сачавіца з вікаю» выконваюць звеннявая Ніна **Каваленка**, акушэрка Ніна **Бондарава**, звеннявая Валя **Чарняк** і даярка Ганна **Белавус** з калгаса «Бальшавіцкая перамога» Хойніцкага раёна.

НА БУДОЎЛЯХ СЯМІГОДКІ

Лісты з Бярозы

4. Вялікай будоўлі — вялікую ўвагу

Біяграфію чалавека складае яго праца. Добра працуеш — табой ганарыцца калектыў, пра цябе гавораць на сходах, пішуць у газетах. Ты прыйшоў на будоўлю, не маючы сталай прафесіі, але ў цябе ёсць гарачае імкненне ўнесці свой сціплы ўклад у агульнанародную справу, табе дапамогуць стаць спецыялістам. Ты пачаў сумленна працаваць, стаў майстрам сваёй справы, і людзі добрым словам ацанілі тваё стваранне.

На будоўлі не толькі прадаўжаюцца, але і пачынаюцца новыя біяграфіі. Побач з вопытнымі будаўнікамі сярод лепшых ужо сёння гучаць многія і многія прозвішчы ўчарашніх вучняў-навічкоў.

Паважаюць на будоўлі брыгадзіра Міколу Драніцу. Ён працаваў мулярам у рудніку Магнітка, у славутым Ангарску. Быў брыгадзірам цесляроў на будаўніцтве Смалявіцкай ДРЭС. Прыехаўшы разам з Фёдарам Міхайлавічам Мешчараковым на Бярозаўскую ДРЭС, ён узначаліў цяслярскую брыгаду, якая ўвесь час перавыконвае нормы.

А вось — Віктар Юркевіч. Юнак з Бярозы. Дэмабілізаваўся з Савецкай Арміі, працаваў на Мінскім трактарным заводзе. Пачуўшы пра будоўлю, прыехаў на радзіму. Тут набыў прафесію муляра. Цяпер ён узначальвае брыгаду. У брыгадзе 33 чалавекі. «Хлопчыкі — на падбор». У голасе Віктара добразычлівая іронія. «Хлопчыкамі» ён называе дзяўчат, а іх у брыгадзе — пераважная большасць.

Віктар Вішанька. У яго не толькі прыгожае прозвішча. Сам ён — малады, дужы. Працаваў пад Масквой, на Шахтабудзе. Потым прыехаў на Бярозаўскую ДРЭС. У брыгадзе Міхаіла Сярмяжкі быў найлепшым мулярам. Яго паслалі вучыцца ў Свярдлоўскую школу брыгадзіраў-будаўнікоў. Скончыў вучобу, вярнуўся на сваю будоўлю, узначаліў комплексную брыгаду. Большасць членаў брыгады — учарашнія навічкі, вучні. Тут яны набылі спецыяльнасць. Іван Лісюк — муляр шостага разраду. Добра працуюць Уладзімір Груша — ён мае ўжо чапвёрты разрад. Адбыліся вялікія перамены і ў асабістым жыцці Віктара Вішанькі — ён ажаніўся з мясцовай дзяўчынай. Жонка таксама працуе на будоўлі.

...Кароткія запісы. Кожны з тых, хто трапіў у гэты «інфармацыйны пералік», належыць да лепшых людзей будоўлі і не ўспомніць іх нельга. Я ведаю, што наступная паездка на Бярозаўскую ДРЭС папоўніць спіс лепшых людзей усё новымі і новымі прозвішчамі, новымі біяграфіямі, якія нараджаюцца сёння на будоўлі.

І ўсё ж простая аб'ектыўнасць патрабуе гаворкі і пра тое благое, што я тут убачыў. Не буду гаварыць пра асобныя арганізацыйныя і бытавыя непаладкі — будоўля яшчэ маладая, і без цяжкасцей не абыйдзешся. Але ёсць непаладкі, на якія кіраўнікам будоўлі аніяк нельга заплюшчваць вочы і якія трэба як мага хутчэй ліквідаваць. Яшчэ ўлетку я быў у сталоўцы. Непрыемна ўразіла мяне, калі яе загадчыца з самым сур'ёзным выглядам тлумачыла прычыну дрэннай работы сталоўкі: «У нас, бачыце, на складзе ўсё ёсць, але ў сталоўку даць не можам, бо... няма калькулятара. На вока цэны прыкідваем». Я, прызнацца, чават не ведаў, што ў дзяржаўнай установе можна «на вока прыкідваць цэны» і спакойна, не баючыся аніякай адказнасці, рэкламаваць такі метад гандлю. Нехта растлумачыў: «Яны ж ад сельпо працуюць». Ну, а для сельпо хіба законы не пісаны?..

І вось у час сваёй другой паездкі на Бярозаўскую ДРЭС, я зноў пабываў у сталоўцы. За паўгода тут нічога не змянілася. Праўда, сталоўку перанеслі ў больш упарадкаванае памяшканне, але ад гэтага меню не стала больш разнастайным, і «славутыя» катлеты не сталі смачнейшымі. Я чуў, як абураліся будаўнікі, і было страшэнна няёмка за кіраўнікоў будоўлі — хіба нельга наладзіць сапраўды ўзорнае харчаванне людзей?!

На Бярозаўскай ДРЭС з радасцю і гордасцю гавораць пра нядаўна пабудаваны клуб. Сапраўды — выдатны клуб. Але тут, акрамя танцаў і дэманстравання кінафільмаў, аніякіх мерапрыемстваў не праводзіцца. Дарэчы, я прысутнічаў на партыйным сходзе, дзе камуністы-будаўнікі з трывогай і абурэннем гаварылі аб тым, што клуб зусім не выкарыстоўваецца для выхаваўчай работы. Гаварылі аб выпадковых людзях, якія трапляюць на пасаду загадчыка клуба, аб адсутнасці гурткоў мастацкай самадзейнасці. А ўвечары я пачуў дзівосную песню. Па вуліцы рабочага гарадка ішла група дзяўчат. Слаўна спявалі дзяўчаты. І падумалася мне — такія галасы маглі б упрыгожыць любы хор. Але бяда ў тым, што на вялікай будоўлі няма сапраўднага арганізатара, каб наладзіць мастацкую самадзейнасць. І міжволі ўзнікла думка — хіба нельга прыслаць на будоўлю вопытнага загадчыка клуба?

І вось тут хочацца зрабіць некалькі закідаў у адрас Міністэрства культуры БССР, ЦК камсамола Беларусі, асобных творчых арганізацый.

Пра Бярозаўскую ДРЭС гавораць, многа пішуць. Яна з'яўляецца ўдарнай камсамольскай будоўляй. Але, прызнацца, я асабіста не адчуў, каб ёй аказвалася сапраўдная шэфская дапамога, удзялялася тая ўвага, якой яна заслугоўвае. Хіба нельга ў тым жа клубе, які мае вялізную глядзельную залу, арганізаваць выступленне мінскіх артыстаў? Гэта было б радаснай падзеяй у культурным жыцці новабудоўлі. Будаўнікі — вельмі ўдзячныя слухачы. Памятаю, як улетку прыязджалі з Брэста ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці — іх сустрэлі з вялікай цеплынёй і пашанай. Тады яшчэ не было клуба, канцэрт адбыўся на імправізаванай пляцоўцы — у гаражы, але і самі ўдзельнікі канцэрта, і іх шматлікія слухачы не адчувалі аніякай нязручнасці. Пра гэты канцэрт доўга ўспаміналі на будоўлі, як і пра другую сустрэчу — са сталічнымі дзеячамі мастацтва.

Але такія сустрэчы — тут рэдкая з'ява. А хацелася б, каб дзеячы мастацтва нашай рэспублікі былі не рэдкімі гасцямі, а пастаяннымі шэфамі. Думаецца, такія сустрэчы прынеслі б многа радасці, узбагацілі б не толькі будаўнікоў, але і саміх дзеячоў мастацтва.

Наладзіць пастаянную шэфскую дапамогу ў культурным абслугоўванні будаўнікоў Бярозаўскай ДРЭС — пачэсны абавязак Міністэрства культуры і ЦК камсамола Беларусі. Дарэчы, трэба паклапаціцца, каб цудоўны клуб будаўнікоў меў, нарэшце, добрага кіраўніка. Варта было б наладзіць камсамольска-маладзёжны лекторый. Шчыра кажучы, добры лектар — таксама рэдкі госць на новабудоўлі.

Тая ж простая аб'ектыўнасць патрабуе самакрытыкі — мы, пісьменнікі, таксама ў вялікім даўгу перад будаўнікамі Бярозаўскай ДРЭС. Яны слушна папракаюць нас за тое, што мы не ўслаўляем іх сапраўды слаўнае жыццё і працу ў мастацкіх творах. Не ўслаўляем, не пішам пра іх таму, што рэдка бываем на будоўлі. За паўтары гады на будоўлі не было наладжана ніводнага літаратурнага вечара, на якім перад будаўнікамі выступілі б беларускія пісьменнікі. Памятаю, якой радаснай падзеяй быў на Васілевіцкай ДРЭС прыезд брыгады беларускіх пісьменнікаў. Прасторная глядзельная зала клуба была перапоўнена слухачамі. Хіба ж нельга Саюзу пісьменнікаў БССР накіраваць такую брыгаду і на Бярозаўскую ДРЭС?

Літаратурныя вечары спрыялі б прапагандзе кніг беларускіх пісьменнікаў, бо і з гэтым пытаннем не ўсё ў парадку на будоўлі. Тут, пры клубе, нядаўна адкрылі бібліятэку, чытальную залу. Але твораў беларускай літаратуры вельмі мала, хоць і карыстаюцца яны попытам у чытачоў.

— Вось бы ўзялі пісьменнікі ды прыслалі нам свае кнігі з аўтографамі, — заўважыла загадчыца бібліятэкі Бярозаўскай ДРЭС і моўчкі паківала галавой — маўляў, няздзейсненая мара.

Але чаму няздзейсненая? Хіба цяжка ўкамплектаваць бібліятэчку кніг з аўтографамі пісьменнікаў, пасласць гэты дарагі для будаўнікоў падарунак. Колькі новых, шчырых і ўдзячных сяброў набудзе кожная з гэтых кніг і кожны з яе аўтараў!

Пленум Саюза пісьменнікаў БССР, які адбыўся нядаўна, абмеркаваў адно з самых важнейшых і надзённых пытанняў — «Пісьменнік і сямігодка». Адбылася страсная, прынцыповая размова не толькі аб ідэйных і мастацкіх якасцях твораў, але і аб пачэсным месцы пісьменніка на галоўных рубяжах сямігодкі. На пленуме прыводзіліся цікавыя факты і лічбы аб сувязі пісьменнікаў з жыццём, аб вялікай колькасці літаратурных вечароў і сустрэч з чытачамі. І ўсё ж адзначалася, што вялікія будоўлі сямігодкі ўсё яшчэ чакаюць пільнай пісьменніцкай увагі і шэфскай дапамогі.

Не прыходзіцца сумняванца, што пасля гэтага пленума наша пісьменніцкая арганізацыя пачне яшчэ больш дбайна ставіцца да новабудоўляў, у тым ліку і да будаўнікоў Бярозаўскай ДРЭС. Вялікай будоўлі — вялікую ўвагу!

Ул. ДАДЗІЕМАЎ.

У Высокаўскім раёне

ПАРАДЫ СЕЛЬСКІМ АРТЫСТАМ

Вялікай папулярнасцю ў раёне карыстаецца калектыў мастацкай самадзейнасці калгаса «Савецкая Беларусь». У складзе яго 65 энтузіястаў мастацкай самадзейнасці. Тут і даярка Люба Кучук, трактарысты Іван Садоўскі, Георгій Позняк і пажылыя калгаснікі Антон Усцінавіч Семянюк, Аляксандр Віктаравіч Мянюк. Кіруе калектывам калгаснік Мікалай Мілкоўскі.

У мінулым годзе самадзейныя артысты выступілі з 30 канцэртамі. Яны пабывалі ў суседніх калгасах імя Леніна, «Бальшавік», імя Дзяржынскага, імя Кірава і інш.

Нядаўна ў калгасных аматараў самадзейнасці пабываў народны артыст СССР Рыгор Шырма. Ён паслухаў выступленні самадзейных спевакоў, даў каштоўныя парады па павышэнню пеўчага майстэрства.

СЯБРЫ КНІГІ

У магазіне «Кнігагандлю» г. Высокае працуюць камсамолкі Аўгіння Плецянюк і Лідзія Чыркова. Абедзве прыйшлі сюды пасля заканчэння дзесяцігодкі.

Да сваіх абавязкаў яны адносяцца па-камсамольску. Магазін з месяца ў месяц перавыконвае планавыя заданні продажу кніг. Ужо ў гэтым годзе прададзена літаратуры амаль на 50 тысяч рублёў.

Вялікую дапамогу ў прапагандзе і распаўсюджванні кнігі аказваюць камсамольцы горада. Яны рашылі сёлета прадаць кніг на 30 тысяч рублёў. Камсамолец Леанід Нікаляцін прадаў літаратуры на 700 рублёў, медсястра райбальніцы Ванда Драбна 400 рублёў.

КІНАЛЕКТОРЫЙ

У раёне некалькі дзён знаходзіўся кіналекторый Брэсцкага абласнога аддзялення Таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў. На прадпрыемствах, у калгасах і РТС быў арганізаваны прагляд кінафільмаў «Праўда аб сектантах-пяцідзесятніках», «Цёмныя людзі» і «Шлях да зор». Перад дэманстрацыяй кінафільмаў з лекцыямі выступілі члены раённага аддзялення Таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў. Так, у калгасе «Расія» і ў Высокаўскай РТС з лекцыяй «Паходжанне і сутнасць хрысціянства» выступіў настаўнік Ваўковіцкай СШ тав. Лазоўскі. Настаўнік Доўбнеўскай сямігодкі тав. Дарашчук у калгасе імя Сталіна прачытаў лекцыі «Атэістычнае выхаванне ў сям'і» і «Ул. І. Ленін аб рэлігіі».

В. БУРЫ.

У бібліятэцы чыгуначнікаў

Добра працуе бібліятэка Гомельскага Палаца культуры чыгуначнікаў імя Леніна. Яе кнігамі карыстаюцца 3 200 чытачоў. Бібліятэкай арганізавана 20 перасовак на Гомельскім чыгуначным вузле і лінейных станцыях. Работнікі бібліятэкі аказваюць дапамогу слухачам універсітэта мастацкага выхавання. Складаюцца рэкамендацыйныя спісы літаратуры ў адпаведнасці з праграмай універсітэта. За апошні час тут праведзены канферэнцыі чытачоў — «Якім павінен быць чалавек камуністычнага грамадства», «Пагаворым пра героя нашага часу» і інш.

М. ГАТОЎКІН.

ДЛЯ БУДАЎНІКОЎ САЛІГОРСКА

Артысты Тэатра оперы і балету часта выязджаюць з канцэртамі ў гарады рэспублікі. Нядаўна група артыстаў тэатра пабывала ў гастрольнай паездцы і выступіла з канцэртамі перад будаўнікамі Салігорскага калійнага камбіната, жыхарамі Слуцка і Старобіна. Артысты С. Друкер, М. Зюванаў, В. Міронаў, В. Ганчарэнка і іншыя выканалі творы беларускіх кампазітараў, арыі з опер, сцэны з балетаў.

ПАГАВОРЫМ ПРА МАЛАДУЮ ПАЭЗІЮ

СЛУХАЦЬ СУЧАСНАСЦЬ

Пра нашых маладых паэтаў крытыка пісала многа і аб кожным паасобку і аб усіх разам, — у маленькіх рэцэнзіях і вялікіх артыкулах, адзначала недахопы і поспехі. А. Лойка выступае супраць вобраза як самамэты, за такую паэзію, у якой «з-за багатай вобразнай фактуры праглядвае рухомае адзінства душы, пэўная чалавечая натура ў яе стаўленні да свету і людзей». Ён адзначае, што прычынай застою маладых было і вузкае, фармальнае разуменне арыгінальнасці, а сапраўдны сакрэт далейшага поспеху маладых — «на шляхах яднання з думамі народа і запатрабаваннямі часу». Такім чынам, у артыкуле «Крылы для ўзлёту» А. Лойка ўзняў сур'ёзныя пытанні, засяродзіўшы ўвагу на недахопах творчасці маладых.

Неўзабаве з артыкулам «Крылы не толькі для ўзлёту» выступіла Еўдакія Лось. Яна піша: «Агульшчына нічога не дасць ні чытачу, ні літаратуразнаўству, ні тым больш маладому паэту». Па-першае, калі ў Е. Лось такія погляды, то, магчыма, для яе асабіста распачатая размова «нічога не дасць», а па-другое «агульшчына» і размова пра агульныя тэндэнцыі, відавочна, не адно і тое ж.

Мімаходзь Е. Лось папракае А. Лойку ў неаб'ектыўнасці, прыпісвае яму толькі пафас адмаўлення: «Нельга ў аб'ектыўнай гутарцы аб паэзіі цэлага перыяду не заўважаць таго, што зроблена». «Агульшчына», пра якую гаворыць Е. Лось, аказваецца, складаецца з досыць канкрэтных палажэнняў, з якімі яна спрабуе спрачацца: «Крытык крытыкуе крытыкаў (з'ява сама па сабе цікавая) за няправільную, на яго думку, арыентацыю маладых паэтаў». Не будзем звяртаць увагі на трохразовае паўтарэнне аднаго і таго ж слова і задумваццa, у чым незвычайнасць і цікавасць з'явы, што «крытык крытыкуе крытыкаў». Будзем чытаць далей. Е. Лось цытуе з артыкула А. Лойкі: «Неспрактыкаваны малады паэт пачынаў уяўляць, што паэзія — гэта толькі паэтычны вобраз, задача паэта — у пошуках яркага, арыгінальнага, запамінальнага вобраза». Е. Лось сцвярджае, што размова ніколі не вялася так звужана. Але ж да чаго зводзіць размову сама Е. Лось? Зноў жа такі толькі да вобразных знаходак, альбо, як яна іх называе, «ягадак» (якое, дарэчы, няўдалае слова), «сабраных маладымі паэтамі». Між іншым, хочацца паспрачацца і з гуетам Еўдакіі Лось. Наўрад ці можна лічыць «ягадкамі» прывезеныя ў артыкуле радкі з верша А. Наўроцкага. Але гэта не галоўнае. Са слоў Е. Лось атрымоўваецца, нібыта А. Лойка — прыхільнік пазавобразнай дэкларатыўнасці. Яна ж, Е. Лось, таксама прызнае, што неабходна, «нават, у першую чаргу», змагацца за багацце духоўнага жыцця, але даказвае, што А. Лойка не прызнае вобразнасці, а «вобраз,—піша Е. Лось,—як адна з першаасноў паэзіі хваляваў, хвалюе і будзе хваляваць як падлетка, які толькі ўзяўся за пяро, так і, асмелюся сцвярджаць (надзвычай «смелае» сцвярджэнне. — **В. Б.**), сівагаловага байца паэтычнага фронта». Але ж Лойка выступае зусім не супраць вобразнасці, а за тое, каб «вобразная фактура была напоўнена багаццем духоўнага жыцця». Згаджаючыся і не згаджаючыся з А. Лойкам, Е. Лось усё ж прызнае, што маладым паэтам 50-х гадоў «не ставала вялікага роздуму аб жыцці, аб нашай непаўторнай сучаснасці, аб сучасніку...»

Гэтая палеміка прымушае яшчэ раз агледзець паэтычную гаспадарку маладых. Пры ўсёй неакрэпленасці слова «маладыя» ў артыкуле А. Лойкі маюцца на ўвазе, відаць, тыя паэты, якія ў самы апошні час выдалі свае першыя зборнікі і тыя, якія ўжо вызначылі свой почырк у нашай маладой паэзіі. Усе яны прыйшлі ў літаратуру нядаўна. У іх многа агульнага і ў адносінах да жыцця і ў жыццёвым лёсе. Іх дзяцінства супала з гадамі вайны, а юнацтва — з навучаннем у ВНУ і пасляваенным будаўніцтвам. Зразумела, што і пішуць яны пра сваіх аднагодкаў, пра іх думы і пачуцці. Раскрываючы любы са зборнікаў маладых паэтаў, мы сустракаемся з маладым савецкім юнакам—нашым сучаснікам, які створаны не пісьменніцкай фантазіяй, а самім жыццём, нашай рэчаіснасцю. Маладыя нашы паэты ўмеюць пісаць аб сабе і аб часе і падкрэслена-публіцыстычна, з вялікім грамадзянскім пафасам:

Такія, мусіць, косці ў нас —
Нам у пуху не спіцца,
Такія, мусіць, ногі ў нас —
Нідзе нам не сядзіцца,
Такія, мусіць, рукі ў нас —
Ніяк ім не стаміцца.

(К. Цвірка).

Голасам свайго пакалення яны гавораць і аб жахах вайны, і аб гераічнай барацьбе за свабоду, і аб бясхмарнай маладосці. Пачуццё любві да роднага краю, радасць жыцця пад бясхмарным небам яны насычаюць эмацыянальнай канкрэтнасцю: «Прыязджайце да нас на Полаччыну, пахадзіце яе прасторамі», — піша Г. Бураўкін. Оршу славіць Ул. Караткевіч, аб родных Ушачах піша Р. Барадулін. Пішуць маладыя паэты і вершы пра вайну, дасягаючы мастацкасці тады, калі пачуцці прапушчаны праз прызму аўтарскага «я», як гэта адчуваецца ў вершы Р. Барадуліна «Бацьку»:

Не йшоў ты...
Маці маладосць
Глыбей заворвалі маршчыны.
Паверыць цяжка мне таму,
Што больш не прыйдзеш ты
дадому,
А шапку я заўжды здыму
Перад магілай незнаёмай.

У падыходзе да вырашэння тэмы праяўляюцца аўтарскія індывідуальнасці. Калі адкінуць, як казаў Бялінскі, «рытарычную шуміху, набор агульных месц» і агаліць іх творчую сутнасць, то можна вызначыць самабытнае, што кожны з маладых нясе ў родную літаратуру.

Крытыка ўжо адзначала індывідуальныя рысы многіх з маладых паэтаў. Няма патрэбы гэта пераказваць. Значна важней разгледзець здабыткі маладых з пазіцый усёй беларускай літаратуры. Менавіта з гэтых пазіцый робіць А. Лойка свае вывады, з якімі спрабуе спрачацца Е. Лось.

Наша сучасная лірыка імкнецца да адлюстравання самых складаных душэўных рухаў чалавека, да вынікаючага з гэтага шырокага выкарыстання розных форм мастацкага раскрыцця духоўнага свету чалавека, да моцнага лірычнага падтэксту. Гэтае імкненне па-рознаму праяўляецца ў творчасці маладых, але, на нашу думку, найлепш за ўсіх у творчасці Р. Барадуліна.

Для Р. Барадуліна характэрна ўдалае спалучэнне глыбокіх думак і вобразнай формы верша, умелае выкарыстанне ўдала знойдзеных канкрэтных, часцей за ўсё зрокавых вобразаў. Яго вобразы настолькі западаюць у памяць, што іх хочацца паўтараць: «Лёс далёкага краю, дзе як быццам маршчынку на лбе, сцежку кожную знаю»; «І трашчыць кулямётнай чаргой на кастры сыраваты яленец»; сланечнікавыя семкі, як шмялі ў сотах; коцікі вярбы, як кураняты. Вобраз у Барадуліна можа выконваць ролю трапнай дэталі («На Свіслачы праныры-галкі трываласць лёду правяраюць»); малады паэт умее і стварыць глыбокі падтэкст, узмацніць вобразам настрой. Прыгадаем хаця б верш «Вясна ў Брэсцкай крэпасці».

Хор салаўёў не моўкне на зары.
Смерць больш не хмурыцца
халоднай птушкай.
Вясёлка сяміцветная гарыць
Над крэпасцю, як ордэнская
стужка.

Або верш «У роднай хаце»:

І фікус, што я флянцам помню,
Уперся ў столь ілбом ліста.

І гэтак Барадулін умее гаварыць аб усім: аб Радзіме, аб каханні, аб пачуцці інтэрнацыянальнай дружбы. Яго вершы багатыя разнастайнымі настроямі. Лірычны герой усміхаецца, радуецца, часам трошкі сумуе (як у цудоўным вершы «Світаняў з табой сустракаў...»), адчувае боль вялікай страты («Бацьку»). Можна адзначыць яшчэ і гумар, які пранізвае многія з вершаў Р. Барадуліна.

Нам здаецца, што А. Лойка крыху перабольшвае, калі гаворыць, што ў Р. Барадуліна яшчэ не заўсёды вобразная фактура напоўнена багаццем духоўнага жыцця. Багатае духоўнае жыццё лірычнага героя цалённага цыкла ды і ўсяго зборніка «Маладзік над стэпам» цяжка аспрэчваць.

Ул. Караткевіч таксама вылучаецца сярод маладых паэтаў. Крытыка адначала ўжо добрую засяроджанасць яго на ўнутраным свеце чалавечых думак і перажыванняў, несумненны талент эпічнага апавядальніка, параўнальна высокі ўзровень моўнай культуры. Ім напісаны рад цудоўных вершаў — «Партызанская балада», «Матчына душа», «На пачатку дарог». Але многія мясціны асобных вершаў адзіўляюць надуманасцю дэталей і няяснасцю думкі. Як пісаў Р. Бярозкін, «сапраўдная паэтычнасць — у высокай кандэнсацыі жыццёвага зместу», а яе не стае некаторым вершам Ул. Караткевіча. Нам застаецца спадзявацца разам з Е. Лось, што арыгінальнасць паэтычнага адчування з'яў у Караткевіча не перарасце ў арыгінальнічанне.

У Г. Бураўкіна лепшыя вершы вызначаюцца павышанай эмацыянальнасцю і сілай непасраднага пачуцця, якія тонка перадаюць імклівасць жыцця і аўтарскія думкі і перажыванні:

Я часам сам сябе не пазнаю,
Разважлівы, спакойны і цвярозы,
Пра маладосць бясхмарную маю
Усё часцей ка мне прыходзіць
роздум.

Для Ю. Свіркі характэрна імкненне да глыбокага роздуму, да лаканічнага верша. Ю. Свірка здолеў напісаць рад добрых вершаў і на партызанскую тэму.

Але ўсё-такі з твораў нашых маладых паэтаў вобраз маладога сучасніка паўстае звужана. Гэта часцей за ўсё студэнт, які жыве ў сталіцы, бывае ў сябе дома летам і адночы з'ездзіў на цаліну. Ён нават часам перабольшвае цяжкасці: «Самыя цяжэйшыя экзамены сёння нам даводзіцца здаваць» (пра цаліну). Для маладой літаратурнай змены дасягнутага і зробленага недастаткова. Трэба, каб маладыя паэты валодалі ўменнем творча пераўвасабляцца, паказваць ва ўсёй разнастайнасці жыццё, але ім гэта часта не пад сілу. Гэта тлумачыцца нескладанасцю жыццёвых біяграфій, адсутнасцю жыццёвага вопыту ў маладых паэтаў. Зразумела, і тут можна многага дасягнуць, дзякуючы творчым пошукам, але іх адных недастаткова.

Вельмі небяспечным здаецца тое, што маладыя ў большасці не ідуць далей капіравання вядомых форм (А. Лойка, усё ж перабольшвае, калі гаворыць аб эпігонстве. Эпігонствам можа быць толькі халоднае перайманне чужога). Маладыя паэты стварылі шмат запамінальных вобразаў. Але тут не ўсё добра. Сустракаюцца нават паўтарэнні. Параўнаем з адпаведнымі рускімі: «Убачыць гэтых гледачоў героямі на новай сцэне («Как наша смена играть на нашей сцене будет нас»), «Гады няўмольна паскараюць бег, мільгаюць, быццам кадры на экране» («А дни летят, как ленты в кинозале»). Гэта, зразумела, выпадковыя супадзенні, але ад іх трэба назбаўляцца.

Значна горш выглядае справа, калі гаворыць аб інтанацыйным малюнку

МАСТАЦТВА — У МАСЫ

Любоў да музыкі нараджаецца ў школе

Нягледзячы на тое, што музычная адукацыя школьнікаў за апошні час намнога палепшылася, тэмпы гэтага паляпшэння не задавальняюць запатрабаванняў жыцця. Выкладанне спеваў і музыкі ў многіх выпадках вядзецца на нізкім узроўні. Таму цяжка забяспечыць выкананне праграм Міністэрства асветы ў гэтай галіне.

Настаўнікі пачатковых класаў у свой час не атрымалі неабходнай музычнай падрыхтоўкі, не ведаюць нот, школьных песень. Яны не могуць дамагчыся прадугледжанага праграмай узроўню музычнага развіцця вучняў.

Правільна весці ўрокі спеваў немагчыма, бо праграма па гэтаму прадмету мяняецца амаль кожны год, асабліва для школ з беларускай мовай навучання. У распубліцы няма спецыяльных падручнікаў, метадычных распрацовак, школьных песеннікаў, табліц, музычных інструментаў, партрэтаў кампазітараў, нотных табліц, патэфонаў і шмат чаго іншага. Такое становішча даўно непакоіць настаўнікаў. Не выпадкова з розных канцоў рэспублікі ў Міністэрства асветы пішуцца просьбы дапамагчы педагогам развучваць школьныя песні праз рэспубліканскі радыёцэнтр і выдаць падручнікі па спевах. Міністэрства асветы яшчэ ў снежні 1957 г. прыняло на калегіі пастанову аб выданні розных дапаможнікаў па спевах, але да гэтага часу пастанова гэтая не выканана.

Неадкладная задача павышэння якасці выкладання спеваў, паляпшэння музычнага выхавання ў агульнаадукацыйнай школе могуць быць вырашаны сумеснымі намаганнямі міністэрстваў асветы, культуры, вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі і Саюзам кампазітараў Беларусі.

Неабходна тэрмінова ўпарадкаваць справу падрыхтоўкі настаўнікаў у педінстытутах, музычных, музычна-педагагічных вучылішчах і ў кансерваторыі.

У Мінскім, Гомельскім і Віцебскім педінстытутах на факультэтах настаўнікаў пачатковых класаў многія студэнты не маюць дастаткова развітага музычнага слуху і пеўчага голасу. Нельга мірыцца і з тым, што ў гэтых інстытутах музычную падрыхтоўку будучых настаўнікаў даручана весці не вопытным метадыстам, а пераважна маладым дырыжорам-харавікам, якія не ведаюць ні педагогікі, ні методыкі выкладання спеваў у пачатковай школе.

Нездавальняючая і падрыхтоўка настаўнікаў спеваў V—VII класаў у музычных педвучылішчах. Настаўнік спеваў, які валодае толькі скрыпкай, мандалінай або домрай, не можа задаволіць запатрабаванняў школы. Практыка паказала, што ўся музычная навучальная і пазакласная работа ў агульнаадукацыйнай школе павінна мець адзіны планавы напрамак і канцэнтравацца ў адных руках. Там, дзе ўрокі спеваў у V—VII класах, факультатыўнае спяванне ў VIII—X класах і заняткі школьных хораў вядзе адзін настаўнік, музычнае развіццё вучняў і музычна-вакальная мастацкая самадзейнасць — на належнай вышыні. Калі ж настаўнік валодае толькі струнным інструментам, для выступлення гурткоў школьнай самадзейнасці запрашаецца пабочны акампаніятар-баяніст (для аплаты пастаяннага акампаніятара школа не мае сродкаў), які часта сваёй ігрой зводзіць на нішто ўсю мастацкую апрацоўку канцэртных нумароў. Таму ў музычных педвучылішчах рэспублікі трэба абавязкова ўвесці навучанне на двух інструментах: на баяне і фартэпіяна.

Жыццё патрабуе ўнесці змены ў навучальныя планы дырыжорска-харавых аддзяленняў музычных вучылішч рэспублікі. Студэнты-харавікі, якія навучаюцца ў іх, праходзяць практыку па выкладанню спеваў у пачатковых класах, а пасля заканчэння вучобы атрымліваюць прызначэнні настаўнікамі спеваў у V—VII класы. Там, трапляючы ў незнаёмыя для іх умовы работы і, не маючы магчымасці за кароткі тэрмін засвоіць педагогіку, своеасаблівую методыку вывучэння нотнай граматы ў гэтых класах, яны становяцца бездапаможнымі, губляюць аўтарытэт сярод вучняў і калектыву настаўнікаў, трацяць веру ў свае сілы і здольнасці і кідаюць педагагічную працу.

Не спраўляюцца з работай настаўнікаў спеваў V—X класаў і выпускнікі дырыжорска-харавога аддзялення Белдзяржкансерваторыі. На метадычныя заўвагі старэйшых калег яны звычайна адказваюць: «Я — хармайстар, а не настаўнік! У кансерваторыі нас не вучылі, як праводзіць урокі спеваў!»

Міністэрству асветы неабходна арганізаваць летнія курсы ўдасканалення для настаўнікаў-прадметнікаў, якія па сумяшчэнню вядуць урокі спеваў.

Штогадовае развучванне на курсах песень праграмы па слыху з настаўнікамі спеваў, якія не ведаюць нот, не забяспечвае дакладнасці запамінання мелодый і магчымасці ўвядзення ў V—X класах нават двухгалосага спявання. Таму Міністэрству асветы трэба перабудаваць праграму гэтых курсаў, каб усе настаўнікі спеваў-сумяшчальнікі навучыліся іграць па нотах на інструментах з замацаванымі ладамі або з клавішамі (мандаліна, домра, баян) хоць бы мелодыі песень у танальнасцях з ключавымі знакамі.

У сувязі са зменамі ў праграме па спевах пры пераходзе школ на васьмігадовае навучанне трэба ўсіх настаўнікаў спеваў, якія маюць музычна-педагагічную адукацыю, а таксама тых, якія скончылі музычныя вучылішчы і кансерваторыю па розных спецыяльнасцях, запрасіць на кароткатэрміновыя курсы.

Для праграмы пачатковых класаў патрэбны беларускія тэматычныя песні, прысвечаныя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, Леніну, Савецкай Арміі, Першамаю і г. д. Беларускіх песень такога зместу вельмі мала. Беларускім паэтам і кампазітарам час палумаць аб стварэнні такіх песень. Для першакласнікаў трэба стварыць высокамастацкія «папеўкі» (адна-матыўныя песенькі), на якіх дзеці будуць вывучаць размяшчэнне гукараду на лінейках нотнага стана і вучыцца спяваць адрэзкі гукараду ў песнях, а ў другім класе навучацца па гэтых папеўках спевам з ліста.

Адбор песень для ўключэння ў праграму павінен быць даручаны камісіі, у якой удзельнічалі б асобы, кампетэнтныя ў педагогіцы, методыцы выкладання спеваў, музыцы, паэзіі і вакале.

Ненармальнае становішча склалася ў школах рэспублікі ў гэтым навучальным годзе з вывучэннем беларускай песеннай творчасці ў пачатковых класах. Большасць беларускіх песень, уключаных у музычную праграму, нідзе нельга дастаць. Патэфонных пласцінак з запісамі беларускай музыкі і песень у продажы амаль не бывае.

У сувязі з указаннем у навучальным плане Міністэрства асветы БССР аб тым, што ў VII, IX і X класах адводзіцца тры гадзіны ў тыдзень для вывучэння розных відаў мастацтва, у многіх сярэдніх школах распачаты ўрокі факультатыўнага спявання. На іх развіваецца музычны кругагляд вучняў. У большасці школ вучні IX класаў зусім пазбаўлены ўрокаў спеваў.

З кожным годам усё шырэй распаўсюджваецца ў сярэдняй школе практыка, калі замест выканання ўсіх раздзелаў праграмы на ўроках спеваў у V—X класах праводзіцца развучванне адных і тых жа песень. Гэта робіцца толькі для таго, каб на аглядзе школьных хораў выставіць «зводны» хор школ у 200—300 чалавек, не лічачыся з тым, што такія хоры, як правіла, стаяць на нізкім мастацкім узроўні.

Наогул пытанне аб аглядах школьных харавых гурткоў патрабуе карэннага перагляду. Падрыхтоўка да агляду на веснавых канікулах пачынаецца толькі пасля правядзення школьнага тэматычнага ранішніка, прысвечанага дню Савецкай Арміі. Праходзіць яна ў спешцы, адбірае многа сіл і часу ў вучняў, парушае нармальную агульнашкольную музычную, а часам і навучальную работу школы, пачынаючаюцца рэпетыцыі хору, урокі спеваў замяняюцца рэпетыцыямі хору, удзельнікі хору вызваляюцца з урокаў па іншых прадметах і г. д. і да т. п. А вынік ад гэтых аглядаў мізэрны. Некаторыя школы на працягу двух—трох год паказваюць адны і тыя ж нумары і на адным і тым жа мастацкім узроўні.

Міністэрства асветы БССР можа і павінна палепшыць выкладанне спеваў у агульнаадукацыйных школах. Але для гэтага трэба выдаць падрыхтаваныя да друку падручнікі па спевах хоць бы для I і II класаў, метадычныя распрацоўкі да іх і нотныя табліцы. Апрача таго трэба дапамагчы інстытутам удасканалення настаўнікаў укамплектаваць штаты метадыстамі па спевах і накіраваць іх дзейнасць на вывучэнне песень праграмы і музычнай граматы на раённых семінарах па спевах, у куставых сельскіх і школьных метадычных секцыях, перабудаваць работу навукова-даследчага інстытута педагогікі і дапамагчы яму вывучыць, абагульніць і распаўсюдзіць на школах рэспублікі лепшы вопыт перадавых настаўнікаў спеваў.

І. ПАПОЎ,
метадыст па спевах Мінскага інстытута ўдасканалення настаўнікаў.

З агляду калгасна-саўгаснай самадзейнасці

На здымку: прыпеўкі «Аб кукурузе» выконвае кукурузаводчае звяно калгаса «Перамога» Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці.

Квінтэт братоў **Лубковых: Валерый, Мікалай, Уладзімір, Віктар, Генадзій** (конзавод № 59 Гомельскага раёна).

Сяброўскі шарж **Л. Чурко.**

ку вершаў, аб рыфме, аб гукавым афармленні. Сапраўды дзіўна, да чаго аднастайнымі бываюць вершы маладых паэтаў. Успомнім хаця б вершы Ю. Свіркі «І сэрца зноў пяе», «Ізноў ліюць халодныя дажджы», «Ізноў пацеюць круглыя ўзгоркі», «Дарога зноў цяжкая і даўгая» і г. д.

Звычайна адзначаюць, што пошукі ўзмацнення выразнасці верша вядзе А. Наўроцкі. А. Наўроцкі ўмее часам глыбока і шчыра перадаваць пачуцці:

Ці ж я мог засмяяцца, калі дым
зачарніў усё неба,
Калі грукатам танка з крыжам
мой край аглушылі,
Калі жыў я ля вады і ля хлеба
без хлеба,
Калі цэлымі суткамі кулі секунды
лічылі.

Але А. Наўроцкаму яшчэ не стае вельмі многіх якасцей: моўнай і паэтычнай культуры, цэльнасці. Часамі ж, збліжаючы верш з напаўрытмічнай прозай, ён прыходзіць да страты адчування паэтычнасці. Можна аспрэчваць паэтычнасць тых радкоў, якія прыводзіла ў сваім артыкуле Е. Лось:

Раніцою ты паднімаўся.
Сонца таксама падымалася высока
ў небе.
Ты браўся за шуфель
І ўсё варочаў і варочаў шуфлем.

У многіх вершах маладых паэтаў можна адзначыць беднасць рыфм (ляскат — кустанайскі, карт — хмар, гара — Джэтыгара, свае — п'еш). Праўда, К. Цвірка, з вершаў якога ўзяты гэтыя прыклады, спрабуе авалодаць складанай марфалагічнай рыфмай (дзень які — венікаў, Міхасік мой — абцасікам, лёс такі — лёскатам).

Здзіўляе, што маладыя паэты пазбягаюць унутранай рыфмы і недаацэньваюць гукавую афарбоўку верша, дзе беларуская паэзія мае сталыя традыцыі. Сустракаюцца такія нязграбныя радкі: «Воўк к кавалю прыходзіць» (Р. Барадулін). Толькі калі-нікалі напаткаеш добрую алітэрацыю: «Гулкі колаў ляскат» (К. Цвірка), «Ліецца шумная пшаніца, увішна шоргаюць лапаты» (Р. Барадулін). Але тут жа побач сустракаюцца выпадковыя агаласоўкі: «зорным золатам размолатым» (Р. Барадулін), «Хаця б і вырвалі з-пад ног яго плугамі глебу» (К. Цвірка). Ад такіх «дробязей» нельга адмахвацца. Без гэтага не можа быць напісаны добры верш.

Толькі творчы падыход і сур'ёзныя пошукі дапамогуць маладым паэтам узняцца вышэй узораў. Толькі пошукі найлепшай адпаведнасці слова думцы (а не пошукі асобных ізаляваных прыёмаў) дапамагаюць арганічна расці мастацкаму таленту, уздымаюць яго над вучнёўствам. Міхаіл Ісакоўскі параўноўваў паэтычную творчасць са спяваннем: калі няма добрага голасу, дык нельга спяваць на сцэне. У нашых маладых паэтаў добрыя і розныя галасы. Перыяд вучнёўства часта прыводзіць да ломкі голасу. А паэтам, як і плыўцом, можа лічыцца той, хто ўмее сам, без чужой падтрымкі рассякаць хвалі, г. зн. сказаць сваё слова, адкрываць невядомае, свежае, але адпавядаючае настроям сучаснікаў. Патрэбен глыбокі роздум аб лёсе свайго пакалення. Трэба пазбаўляцца дробных думак, так званай «капеечнай» філасофіі.

Трэба слухаць сучаснасць, жыць ёю.

В. БЕЧЫК,
студэнт БДУ імя Ул. І. Леніна.

Новыя кнігі

Выйшлі з друку і паступілі ў продаж наступныя кнігі мастацкай, дзіцячай і музычнай літаратуры, выдадзеныя Дзяржаўным выдавецтвам БССР.

Маргарыта Яфімава. Янка Маўр. Жыццё і творчасць. Мастак В. Варыёнчык. Тыраж 7 тыс. экз., стр. 128. Цана 3 руб. 05 кап.

І. Я. Навуменка. З глыбінь жыцця. Крытычныя эцюды. Аб творчасці Якуба Коласа. Тыраж 5 тыс. экз., стар. 112. Цана 3 руб. 90 кап.

Усевалад Кочатаў. Браты Яршовы. Раман. Пераклад з рускай мовы І. Грамовіча і М. Хведаровіча. Мастак Ю. Пучынскі. Тыраж 8 тыс. экз., стар. 476. Цана 9 руб. 60 кап.

Алесь Якімовіч. Вераб'ёвы госці. Для малодшага ўзросту. Малюнкі Е. Лось. Тыраж 75 тыс. экз., стар. 16. Цана 1 руб. 15 кап.

Хрэстаматыя па беларускай музычнай літаратуры. Том І. Сімфанічная музыка. На рускай мове. Укладальнік С. Нісневіч. Мастак А. Лісічнікаў. Тыраж 3 тыс. экз., стар 176. Цана 8 руб. 95 кап.

Р. Анчыкаў. Песня аб шчасці. Песня моладзі. Для хору з ф-на. Словы А. Дзеружынскага і А. Русака. Тыраж 1 тыс. экз., стар. 8. Цана 80 кап.

Я. Цікоцкі. За птушкамі. Для высокага голасу з ф-на. Словы В. Віткі. Тыраж 2 тыс. экз., стар. 4. Цана 35 кап.

Л. Абеліёвіч. Рамансы. Для баса з ф-на. На словы Ф. Цютчава. На рускай мове. Мастак І. Эйдэльман. Тыраж 1 тыс. экз., стар. 36. Цана 3 руб. 40 кап.

Артур ВОЛЬСКІ

Новыя вершы

Два моры

Петрусю Макалю

Два моры:
абодва,—
як моры,
бязмежныя.
На хвалях
цвітуць
грабяні беласнежныя.
І чайкі
гарлаюць
ва ўсе галасы
на дым парахода,
на парус касы.
Два моры —
лагодныя,
сціплыя,
грозныя,
падобныя гэтак
і гэткія розныя.
Адно з іх —
зялёнае,
сіняе,
чорнае;
Другое —
бурштыннае,
белае,
зорнае.
Адно закахана
ў платаны
і ў пальмы,
у скалы,
што сонцам,
як бронза,
абпалены.
Другому да густу
бяздомныя дзюны
і сосны,
напятыя ў неба,
як струны.
Два моры —
як два чалавекі зусім.
Ды толькі спаткацца
не дадзена ім.

РАССТРАЛЯНАЯ СМЕРЦЬ

Незвычайная наша работа:
У нас і сёння — яшчэ вайна.
Мы высочваем смерць,
што ўпотай
Пазірае з морскага дна.
Ледзь за хвалямі сонца зайграла,
Адгрымелі званы — у паход!..
І ўразаецца лемех трапа
У цалінную тоўшчу вод.
Ціха!..
Ледзь не пад самым
днішчам —
Штосьці чорнае...
Вось яна!..
Знішчыць нас,
калі мы не знішчым,
Смерць,
што кінула тут вайна.
Заржавелы метал рагулак
Тваню доннай зарос,—
відаць.
Як жа,
мора,
магло прытулак
Ты ў глыбінях сваіх ёй даць!
Што ж —
мы ўхопім яе за горла,
Не хавацца ёй больш ні дня...
Сцяты сківіцы,
ўсё замёрла.
Як на могілках —
цішыня.
Раптам —
гром!
Ускіпелі воды,
Нібы ўзняў іх магутны смерч,
Пахаваўшы —
ужо назаўсёды —
Расстраляную намі смерць...
Неспакойная наша работа:
У нас і сёння — яшчэ вайна.
Мы высочваем смерць,
што ўпотай
Пазірае з морскага дна.

Севастопаль.

СТАРЫ ТОМ

У Таліне на гарадской ратушы здавён устаноўлен флюгер — фігурка вартавога. Эстонцы называюць яго старым Томам.

Над шпілямі гатычных дахаў,
Над густой зеляніной стром
Век ад веку
стаіць без страху
Вартаўнік —
састарэлы Том.

Круціць Тома,
як хоча,
вецер,
І таму, відаць, вартаўнік,
Перабачыўшы ўсё на свеце,
Нос па ветру трымаць прывык.

Бачыў ён і датчан і шведаў.
Бачыў немцаў.
Глядзіць на нас.
А ці думаў стары,
Ці ведаў,
Што настане цудоўны час,
Калі гэтак жыццё паверне,
Што не сніў аніхто і ў сне,
І на стол
залатое зерне
Сонца шчодрае ўсім сыпне.

Доўга людзі шукалі шчасця.
Ёсць цяпер ім,
што берагчы.
Каб ніхто
не мог яго скрасці,
З мора выплыўшы,
уначы.

Ды на Тома надзеі мала.
Зленаваўся зусім стары.
Лепш прыслухайся:
ля прычала
Гучна грукаюць якары.

Пазяхае санліва Талін
У халодную ноч,
калі,
Сон забыўшы,
да вод нейтральных
У дазор ідуць караблі.

ПРАЦЯГ РАНЕЙШАЙ ТЭМЫ

Міхась Ларчанка ў новай сваёй кнізе, якая нядаўна выйшла з друку*, прадаўжае распрацоўку праблемы, што была ў цэнтры і ранейшай яго працы («На шляхах да рэалізма», 1958). Гэта праблема станаўлення і развіцця рэалізма ў беларускай дакастрычніцкай літаратуры.

Тэматычай кніга, як бачым, звернута ў мінулае, але ідэйным зместам звязана з сённяшнім днём. Праблема, пастаўленая ў ёй, — надзвычай важная, патрэбная для сучаснасці. Паспяховае яе вырашэнне дапаможа глыбей і паўней зразумець заканамернасці развіцця сучаснай літаратуры, паспрыяе стварэнню сапраўды навуковай гісторыі роднай літаратуры.

Значэнне кнігі «Па шляху рэалізма» яшчэ і ў тым, што яна аб'ектыўна накіравана супраць сучасных рэвізіяністаў у літаратуры і мастацтве, прыхільнікаў так званай мадэрнісцкай эстэтыкі, якія ігнаруюць класічныя рэалістычныя традыцыі і паклёпнічаюць на здабыткі і дасягненні літаратуры сацыялістычнага рэалізма.

М. Ларчанка арганічна звязвае літаратурны працэс з гісторыяй народа, з жыццём эпохі, з агульнарасійскім рэвалюцыйна-вызваленчым рухам, падкрэслівае думку аб тым, што мастацкая літаратура ў Беларусі развівалася ва ўмовах вострай класавай барацьбы, ва ўмовах гераічнай барацьбы нашага народа за эканамічныя, грамадска-палітычныя і нацыянальныя правы.

Крымская вайна (1853—1855), рэформа 1861 г., сялянскае паўстанне 1863 г. пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага—вось тыя грамадска-палітычныя падзеі, на характарыстыцы якіх спыняе ўвагу даследчык і паказвае іх уплыў на эканамічнае, палітычнае, культурнае і літаратурнае жыццё ў Беларусі.

У кнізе пераканаўча гаворыцца пра жыватворны ўплыў перадавой рускай думкі на абуджэнне палітычнай і нацыянальнай свядомасці беларускага народа, на развіццё яго культуры.

На аналізе канкрэтных гісторыка-літаратурных фактаў аўтар паказвае, што развіццё літаратурнага працэсу не ўяўляе сабою нейкай адзінай, аднароднай плыні. Ён ясна і акрэслена вызначае два асноўныя ідэйна-класавыя напрамкі беларускай літаратуры: кансерватыўна-ліберальны і прагрэсіўна-дэмакратычны.

Прадстаўнікі першага напрамку (Аляксандр Ельскі, Апанас Кісель, Франц Блус, Восіп Арлоўскі, Аляксандр Пшчолка і інш.) імкнуліся паставіць мастацкае слова на службу класавым інтарэсам прыгонніка. Яны ў сваіх творах услаўлялі рэформу 1861 г., абаранялі самадзяржаўна-паліцэйскія парадкі, варожа ставіліся да рэвалюцыйна-вызваленчага руху, прыніжалі беларускі працоўны народ, абвінавачвалі яго ў гультайстве, п'янстве, некультурнасці, адмаўлялі яму ў праве на самастойнае развіццё.

Лагеру цемрашалаў, рэакцыянераў і кансерватараў у беларускай літаратуры супрацьстаяў магутны лагер крытычнага рэалізма, куды ўваходзілі Кастусь Каліноўскі, Францішак Багушэвіч, Янка Лучына, Адам Гурыновіч, Фелікс Тапчэўскі, Альгерд Абуховіч і многія іншыя (невядомыя) аўтары шматлікіх «гутарак» і вершаў.

Кніга «Па шляху рэалізма» змяшчае цэлы шэраг матэрыялаў, якія ў значнай ступені дапаўняюць, пашыраюць і паглыбляюць нашы ўяўленні аб гісторыка-літаратурным працэсе другой палавіны XIX ст. Тут надрабязна гаворыцца аб газеце «Минский листок» (1886—1894), аб часопісе «Гоман», які выдаваўся групай студэнтаў-беларусаў у Пецярбургскім універсітэце, аб «Календары Паўночна-Заходняга краю», вызначаецца роля гэтых выданняў у развіцці беларускай дэмакратычнай культуры. На старонках гэтых выданняў друкаваліся грамадска-навуковыя (напрыклад «Нарысы гісторыі Беларусі» М. Запольскага), этнаграфічныя, фальклорныя і літаратурныя матэрыялы, якія садзейнічалі развіццю рэалістычнага напрамку ў беларускай літаратуры.

Аналізуюцца такія малавядомыя творы, як «Рассказы на беларусском наречии» (1863), «Плач белорусской земли» (1894), «Про панщину» (1894) А. Багдановіча, «Богачи» Я. Брайцава (1889), «Размова двух валуйскіх мужыкоў». У іх абараняецца ідэя нацыянальнай самастойнасці Беларусі, высвятляюцца асноўныя рысы нацыянальнага характару, ставяцца пытанні асветы і выхавання народных мас, крытыкуюцца царскі суд, чыноўніцкі бюракратызм, паказваецца сацыяльна-класавае расслаенне вёскі ў паслярэформенную эпоху.

Больш падрабязна, чым у літаратурна-крытычных працах іншых аўтараў, разгледжана ў кнізе мастацкая публіцыстыка К. Каліноўскага, падкрэслены яе рэвалюцыйна-дэмакратычны змест, вызначана яе месца не толькі ў гісторыі развіцця перадавой грамадскай думкі ў Беларусі, але і ў гісторыі беларускай літаратуры.

Зусім натуральным і апраўданым трэба лічыць тое, што галоўнае месца ў кнізе адведзена вывучэнню літаратурнай спадчыны Ф. Багушэвіча, бо ў творчасці гэтага пісьменніка прынцыпы дэмакратызма, рэалізма і народнасці знайшлі сабе ў параўнанні з іншымі беларускімі мастакамі слова XIX ст. найбольш поўнае і глыбокае мастацкае ўвасабленне.

М. Ларчанка сказаў пра творчасць аўтара «Дудкі беларускай» і «Смыка беларускага» сваё арыгінальнае слова. Так, напрыклад, ніхто яшчэ з даследчыкаў да гэтага часу не звяртаў увагі на наступную важную асаблівасць яго творчасці: на тое, што яна была прасякнута рэвалюцыйным духам, што яна рэвалюцыянізавала масы. Звычайна ў крытыцы Ф. Багушэвіча называюць патрыётам, крытычным рэалістам, дэмакратам, але чамусьці баяцца сказаць, што ён быў, як, напрыклад, і Някрасаў, рэвалюцыянерам-дэмакратам. І тут мы цалкам згодны з М. Ларчанкам, калі ён сцвярджае, што творы Ф. Багушэвіча клікалі народ да актыўных, рашучых дзеянняў, накіраваных на «звяржэнне парадкаў царскай палітыкі ў Беларусі». Праўда, у творчасці Багушэвіча няма адкрытых, яўных заклікаў да рэвалюцыйнай барацьбы, да звяржэння самадзяржаўя, да знішчэння буржуазна-памешчыцкіх парадкаў, але «паэт у сваім рэалістычным паказе жыцця так «групуе факты», так мастацкі абагульняе і падае іх, што яны «колюць вочы» чытачу сваімі «агідпасцямі», страшэннымі несправядлівасцямі, з якімі прымірэнне немагчыма, з якімі неабходна весці рэвалюцыйную барацьбу, знішчаць іх разам з парадзіўшым іх царскім ладам» (стар. 125).

Многа цікавых думак, назіранняў, фактаў знойдзе чытач і ў раздзеле кнігі, дзе вызначаецца роля Янкі Лучыны, Адама Гурыновіча і Фелікса Тапчэўскага ў развіцці рэалістычнага метаду ў беларускай літаратуры. Невядома толькі, чаму М. Ларчанка абыходзіць маўчаннем творчасць такога пісьменніка, як Альгерд Абуховіч, не сказаўшы аб ім ні слова.

Бадай, самы цікавы раздзел кнігі — той, у якім ідзе гутарка аб новых якасцях рэалізма ў беларускай літаратуры пачатку XX ст.

Чым прыцягвае нашу ўвагу гэты раздзел? Тым, што М. Ларчанка пановаму ставіць пытанне пра генезіс сацыялістычнага рэалізма ў беларускай літаратуры.

Аўтар кнігі «Па шляху рэалізма» на аснове канкрэтнага аналізу гісторыка-літаратурных матэрыялаў даводзіць, што працэс станаўлення сацыялістычнага рэалізма ў беларускай літаратуры пачынаецца ў перыяд першай рускай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі. Беларускія перадавыя пісьменнікі, якія выступілі на літаратурную арэну ў пачатку XX ст., у сваёй літаратурнай практыцы ў пэўнай ступені набліжаліся да горкаўскіх эстэтычных прынцыпаў, прынцыпаў сацыялістычнага рэалізма. Яны праўдзіва паказвалі рэвалюцыйную ролю сялянства як саюзніка пралетарыята ў буржуазна - дэмакратычнай рэвалюцыі, бачылі ў працоўных масах рухаючую сілу гісторыі, «сцвярджалі жыццё як творчасць, а чалавека як цудадзейную сілу, якая пераўтварае свет у мэтах пабудовы ў ім такога грамадскага ладу, у якім бы не было месца эксплуатацыі чалавека чалавекам» (стар. 247).

Праблема сацыялістычнага рэалізма ў беларускай літаратуры патрабуе далейшай грунтоўнай распрацоўкі, далейшай канкрэтызацыі, але агульная яе пастаноўка ў кнізе «Па шляху рэалізма» не выклікае пярэчанняў. Вельмі пажадана, каб гэтая праблема была шырока абмеркавана ў нашым друку.

У кнізе «Па шляху рэалізма», такім чынам, многа станоўчага. Кожны хто цікавіцца гісторыяй беларускай літаратуры, знойдзе тут многа карыснага.

Але ці ўсё ў ёй добра? Не, не ўсё.

Сур'ёзны недахоп кнігі ў тым, што аўтар яўна недастаткова асвятляе пытанні пісьменніцкага майстэрства, пытанні мастацкай формы. М. Ларчанка вялікую ўвагу аддае аналізу ідэйнага зместу літаратурных твораў (што з'яўляецца зусім правамерным) і недаравальна мала гаворыць пра іх мастацкую спецыфіку, пра тыя разнастайныя прыёмы і сродкі, з дапамогай якіх той ці іншы пісьменнік дасягаў арганічнага адзінства зместу і формы ў сваіх творах, рабіў іх паэтычнымі, дасканалымі. Ён не раскрывае чытачу прыгажосці мастацкага слова.

Калі ж аўтар часам і пачынае гутарку аб эстэтычных вартасцях літаратурных твораў, то ў пераважнай большасці выпадкаў абмяжоўваецца прыблізнымі заўвагамі, агульнымі словамі, якія падыходзяць амаль да кожнага мастацкага твора, накшталт: «Арыгінальна гучыць заключная страфа верша» (стар. 153, гутарка ідзе аб вершы Ф. Багушэвіча «Дурны мужык як варона»! — **А. М.**) або «**Гучыць** гэтая байка («Воўк і авечка» Ф. Багушэвіч. — **А. М.**) вельмі **арыгінальна і самабытна**» (стар. 166). У пацвярджэнне сваіх палажэнняў М. Ларчанка нічога больш не гаворыць, не раскрывае гэтай арыгінальнасці і самабытнасці і толькі прыводзіць вялікія цытаты з тэкстаў. А вось яшчэ прыклад таго, як аўтар выказваецца аб мове і стылі публіцыстыкі Кастуся Каліноўскага: «Выключнай выразнасці і яркасці мовы і стылю ў сваёй публіцыстыцы Кастусь Каліноўскі дасягаў дзякуючы таму, што ён не аддзяляў сябе ад беларускага народа, быў арганічна, усім сэрцам і душою звязаны са сваім народам, прасякнуўся яго пачуццямі і думкамі, жыў яго ідэаламі, радаваўся яго радасцямі, сумаваў яго горам...» (стар. 45). Усё, што тут сказана, безумоўна, пярэчанняў не выклікае, але мала стасуецца з галоўным прадметам гутаркі, з аналізам публіцыстычнага майстэрства К. Каліноўскага.

Адсутнасць у кнізе аналізу мастацкай формы літаратурных твораў абумовіла тое, што даследчык нічога істотнага не здолеў сказаць пра індывідуальна-творчае аблічча беларускіх пісьменнікаў. У выніку атрымліваецца, што многія пісьменнікі (напрыклад, прадстаўнікі прагрэсіўна-дэмакратычнага лагера) падобны адзін да аднаго, як дзве кроплі вады, і ўклад кожнага з іх у скарбніцу рэалістычнага мастацтва быццам бы аднолькавы, бо характарыстыка гэтым пісьменнікам у кнізе даецца прыкладна адна і тая ж: усе яны былі шчырымі патрыётамі, моцна любілі Радзіму, народ, змагаліся за яго сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне і г. д.

Але ж мы ведаем, што кожнаму мастаку, апрача гэтых агульных рыс, характэрны свой уласны падыход да адлюстравання жыцця, свая ўласная манера, свой голас, свой стыль. Таму хацелася б, каб у кнізе было паказана не толькі агульнае, што збліжае, напрыклад, двух такіх пісьменнікаў, як Ф. Багушэвіч і А. Гурыновіч, але і тое самабытнае, арыгінальнае, што адрознівае кожнага з іх. Навуковыя вартасці кнігі ад гэтага значна павялічыліся б.

У кнізе гаворыцца пра літаратурныя сувязі і ўплывы, даюцца цікавыя супастаўленні, параўнанні твораў беларускіх пісьменнікаў з творамі пісьменнікаў рускіх, украінскіх і польскіх. Але бяда ў тым, што зноў-такі М. Ларчанка падкрэслівае толькі тое агульнае, што родніць беларускіх пісьменнікаў з рускімі, украінскімі, польскімі, але не вызначае іх індывідуальна-творчай манеры. У выніку (хацеў таго аўтар ці не хацеў) у чытачоў можа скласціся няправільнае ўяўленне, быццам бы беларускія пісьменнікі былі толькі пераймальнікамі, эпігонамі рускіх, украінскіх і польскіх пісьменнікаў, а не свядомымі, актыўнымі творцамі.

Істотным недахопам кнігі «Па шляху рэалізма» з'яўляецца недапрацаванасць яе з боку стылю і мовы. Аўтар мала клапоціцца аб форме выказвання сваіх думак, а карыстаецца гатовымі штампамі, няўдала будуе сказы. Упадабаў, напрыклад, даследчык якое небудзь слова, і ён ніяк не хоча з ім растацца. На старонцы 169 чытаем: «Выкрыццю прагнасці селяніна да **грошай**, як выніку **разбэшчаных буржуазна-грашовых** адносін... прысвечана паэма Багушэвіча «Хцівец і скарб на святога Яна». На гэтай жа старонцы, крышачку ніжэй, зноў «падкрэсліваецца **разбэшчваючая** роля **грошай** у буржуазным грамадстве». На наступнай старонцы яшчэ раз чытаем фразу аб тым, што Багушэвіч «рашуча асуджае **разбэшчваючую** сілу **грошай** у буржуазным грамадстве». Пра «разбэшчаную» псіхалогію памешчыка-пана, распуснага эксплуататара гаворыцца на стар. 165 і ў іншых месцах кнігі.

Не ўпрыгожваюць кнігу і такія сказы: «Згодна ўказанню І. В. Сталіна, эпоха канчаткова перамогі капіталізма над феадалізмам ва ўсім свеце была звязана з нацыянальным рухам» (стар. 86), «Згодна ўказанню Ул. І. Леніна, пачынаючы з 80-х гадоў, у Расіі сфарміраваліся дзве асноўныя прагрэсіўныя пазіцыі: агульна-дэмакратычная пазіцыя... і сацыялістычная пазіцыя» (стар. 141). Сказы пабудаваны так, што можна падумаць быццам бы па волі Ул. І. Леніна або І. В. Сталіна, па іх загаду, адбываліся тыя грамадска-палітычныя працэсы, пра якія гаворыць аўтар. Але ж гэта зусім не так!

Хочацца спадзявацца, што аўтар улічыць добразычлівыя пажаданні крытыкі і прадоўжаць работу па распрацоўцы праблемы рэалізма ў беларускай літаратуры.

А. МАКАРЭВІЧ.

* **Міхась Ларчанка.** Па шляху рэалізма. Выдавецтва Белдзяржуніверсітэта імя Ул. І. Леніна. Мінск. 1959.

СПРАВЫ КАЛГАСНЫЯ — СПРАВЫ БІБЛІЯТЭЧНЫЯ

Як зрабіць, каб бібліятэка дапамагала калгаснікам дамагацца ўадыму ўсіх галін сельскай гаспадаркі? Савет бібліятэкі і яе актыў лічаць сваім асноўным абавязкам шырока прапагандаваць кнігу, пры гэтым вялікую ўвагу аддае сельскагаспадарчай літаратуры.

Калісь Горкі гаварыў: «Кніга — крыніца ведаў». Трэба, каб з гэтай крыніцы бралі веды не адзінкі, а ўсе калгаснікі. Яшчэ ў 1957 г. наша бібліятэка з дапамогай актыву дамаглася, каб кнігу чыталі ў кожным доме, у кожнай сям'і. Ужо тады ў нас было 813 чытачоў. Лічба нібы і не такая ўжо малая. Але яна толькі распальвала нашы жаданні і імкненні. Хацелася зрабіць яшчэ больш.

У мінулым годзе ў нашай Касцюкоўскай сельскай бібліятэцы быў адкрыт свабодны доступ чытачоў да кніг. Добры метад. Цяпер сам калгаснік выбірае сабе патрэбную літаратуру. Дык навучы, бібліятэкар, дзе знайсці тую кніжку. Я чытаў сам больш літаратуры, раіўся са спецыялістамі. Такім чынам вывучаю свой кніжны фонд. А ён у нас не малы — звыш пяці тысяч экземпляраў. Дык вось у 1959 годзе паслугамі нашай бібліятэкі карысталася 1 100 чытачоў. Ім было выдадзена за год 13 тысяч экземпляраў кніг, з іх на сельскагаспадарчую тэму — 989 экземпляраў. Сярод нашых чытачоў 489 калгаснікаў, 221 рабочы, 15 служачых, 103 хатнія гаспадыні і 272 вучні.

Мне могуць сказаць: статыстыка гэта. Сапраўды, лічбы ёсць лічбы, але ж у іх відаць і тая работа, якую праводзім мы сярод насельніцтва. У мінулым годзе адбыліся канферэнцыі чытачоў па раману Ул. Дадзіёмава «Над Нёманам», М. Астроўскага «Як гартавалася сталь» і аб вопыце беларускіх кукурузаводаў. Добра прайшлі ў нас літаратурныя вечары на тэмы: «Дэпутат — слуга народа», «Савецкая літаратура ў барацьбе з рэлігіяй».

У бібліятэцы і ў брыгадах праведзена 12 бібліяграфічных агляду новых кніг, якія паступілі на нашы паліцы. Калі вы зойдзеце ў бібліятэку, дык адразу звернеце ўвагу на кніжныя вітрыны: «Што чытаць жывёлаводу... пчаляру... садаводу». Прыцягваюць увагу наведвальнікаў стэнды: «Партыя нас да камунізма вядзе», «Беларусь у сямігодцы», «Абавязацельствы калгаса імя Сталіна на 1960 г.». Ёсць у нас плакаты і лозунгі, прысвечаныя рашэнням XXI з'езду КПСС і снежаньскага Пленума ЦК КПСС.

Наша бібліятэка абслугоўвае вёску Касцюкоўку і чатыры пасёлкі — усяго 468 калгасных двароў. Як і ў кожнай бібліятэцы, у нас працуюць перасоўкі, пункты выдачы кніг. Многа робяць у нас кніганошы — нашы добрыя, шчырыя памочнікі. Вось яны, вялікія кнігалюбы: вучань Васіль Каёшка абслугоўвае пасёлак Сталінец, калгаснікі Соф'я Клемянцова і Мікалай Агароднікаў — пасёлкі Клімаўскі і Іванаўскі, а яшчэ ўмела прапагандуе кнігу Валянціна Пузанава і іншыя.

Калгасніку не прыйдзеш і не прапануеш абы што пачытаць. Ты, бібліятэкар, парай, знайдзі такую кнігу, якая б яго адразу зацікавіла, ад якой бы ён не адмаўляўся, спасылаючыся на адсутнасць вольнага часу. І вырашылі мы прыглядзецца, вывучыць, што найбольш цікавіць таго ці іншага калгасніка.

Цікавыя факты выявіліся, і адразу стала ясна, што трэба рабіць бібліятэцы і яе актыву. Ёсць у нас у пятай брыгадзе калгаснік Апанас Кузьмянцоў. На яго сядзібе пасаджаны ладны садок. І напаткала чалавека бяда: пачалі сохнуць у яго пладовыя дрэвы — і рады ніякай не дасць гаспадар. Раней, калі да яго прыходзілі кніганошы, ён адмахваўся ад іх, як ад надакучлівых мух. Адна ў яго была гаворка: «Няма мне часу вашы кніжкі чытаць, няхай гэта робяць вучні, — гаварыў дзядзька. — ім спатрэбіцца». Аднойчы зайшоў я да яго з вялікім пакункам кніг, завёў гаворку пра садок, паспачуваў, што гінуць у яго дрэвы, а пасля сказаў, што можна яшчэ выратаваць іх, калі вось прачытаць гэтыя кніжкі. А там былі і «Даведнік садавода» і іншая літаратура, як даглядаць і ўгнойваць сад. Паклаў я гэтыя кнігі на стол і хуценька пайшоў. Дзядзька Апанас не паспеў нават адмовіцца ад іх.

Прайшло, відаць, з паўмесяца, а можа і больш. Карціць мне даведацца, што ж з тымі кніжкамі, іх пытаюць ужо іншыя чытачы. Аж неяк пад вечар прыходзіць у бібліятэку Апанас Кузьмянцоў.

— Па,—кажа,—Сямён, твае кнігі, шчыра дзякую табе за іх. Можа, што яшчэ дасі пачытаць пра сады?..

Мне радасна, хочацца шчыра павіншаваць гэтага маўклівага чалавека. Але я нічым не выказваю свае пачуцці і адразу ж даю яму яшчэ адну кніжку па садоўніцтву. А далей і болей стаў ён чытаць. Давялося кнігі яму выпісваць з раённай і абласной бібліятэк. А садок мы яго ўсё ж выратавалі, кніга дапамагла. За год Апанас Кузьмянцоў прачытаў 21 кнігу і ўсе па сваёй любімай справе — садоўніцтву.

Прыгадваецца і такі выпадак. Марыя Паненкіна ўзначальвае ў нашым калгасе кукурузаводчае звяно. Старанна працавалі калгасніцы, але ўсё ж ведаў не хапала. І Марыя пачала прыходзіць у бібліятэку.

— Парай, Сямён, нам добрых кніжак пра кукурузу, каб яны навучылі нас вырошчваць гэтую культуру. — І адразу ж дадала: — Ды, відаць, у цябе такіх кніг няма, усё раманы пра вайну. А ты нам дай такія кнігі, якія б навучылі, як даглядаць гэтую каралеву...

29 кніг аб кукурузе ўзяла з бібліятэкі звеннявая. Разам чыталі іх, вывучалі ўсім звяном. На дапамогу прыйшоў аграном калгаса. І што ж вы думаеце, настойлівая жанчына дамаглася свайго. З плошчы 17 гектараў звяно атрымала па 830 цэнтнераў зялёнай масы кукурузы з гектара. Для пачатку, як кажуць, нядрэнна. А на 1960 г. звяно абавязалася з 30 гектараў выгадаваць тысячы цэнтнераў з кожнага га. Цяпер ад нашых кукурузаводаў і адбою няма. Давай ім новую літаратуру ды і годзе!

Многія калгаснікі шляхам самаадукацыі набылі сабе новыя спецыяльнасці. І бібліятэка ў іх была першым памочнікам і дарадчыкам. Калгасніка Івана Агароднікава зацікавіла літаратура па пчалярству. Ён прачытаў 19 кніг па гэтаму пытанню. Праўленне калгаса даручыла яму даглядаць пасеку ў восьмай брыгадзе. Калгаснік Іван Панамарэнка захапляўся электратэхнікай, ён браў у бібліятэцы адпаведную літаратуру. Кніга дапамагала яму авалодаць спецыяльнасцю. Іван Панамарэнка працуе цяпер у калгасе электраманцёрам.

Павышаныя абавязацельствы ўзяў на 1960 г. наш калгас імя Сталіна. Калгаснікі будуць дамагацца ўраджаю кукурузы па 600 цэнтнераў на плошчы 400 га, збожжавых — па 15, бульбы — 140, гародніх культур па 280 цэнтнераў з гектара. Многа спраў цяпер і ў жывёлаводаў.

Мы будзем працягваць і далей удумліва працаваць з кожным чытачом, каб канкрэтна дапамагчы калгасу выканаць узятыя абавязацельствы. Гэта наш першы і галоўны абавязак. Па-другое, у 1960 г. мы мяркуем давесці лік чытачоў нашай сельскай бібліятэкі да дзвюх тысяч чалавек, гэта значыць, што кнігу ў нас будзе чытаць кожны пісьменны чалавек.

Каб бібліятэка была першым памочнікам партыйнай арганізацыі, нам вельмі неабходна папоўніць свае кніжныя фонды і асабліва раздзел сельскагаспадарчай літаратуры. На вялікі жаль, наша выдавецтва мала выпускае надзённай, вельмі патрэбнай працаўнікам сельскай гаспадаркі, літаратуры. Свінарка нашага калгаса Лукер'я Чайкова абавязалася за 1960 г. выгадаваць тысячу свіней. Мы ведаем, што ёсць у нашай краіне знатны свінар Чыж. Але вось кніг аб яго вопыце ў бібліятэцы няма, не знойдзеш іх і ў магазінах. Расце попыт на літаратуру па пытаннях жывёлагадоўлі і асабліва аб перадавым вопыце. Толькі гэтай літаратуры мала ў нашай бібліятэцы, як і ў кнігарнях і бібкалектары.

Сямён СЕЛЮКОЎ,
загадчык Касцюкоўскай сельскай бібліятэкі.
Гомельскі раён.

Фільмы ў сакавіку

Мастацкая кінакарціна «Нарманды — Нёман» вытворчасці студыі «Масфільм» і кінастудый «Франка-Лонданфільм» і «Алькамфільм» (Францыя) раскажа аб тым, як французскія лётчыкі разам з савецкімі ваявалі супраць фашызма. За мужнасць, адвагу і гераізм, праяўленыя ў баях з нямецкімі захопнікамі, многія з іх былі ўзнагароджаны савецкімі ардэнамі і медалямі, а чатыром нават было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

Фільм пастаўлены па сцэнарыю Шарля Спаака, Эльзы Трыале і Канстанціна Сіманава.

Музыку напісаў савецкі кампазітар Р. Шчэдрын.

Кінааповесць «Салдатка» выпускае на экраны Кіеўская студыя імя А. П. Даўжэнкі.

У аснову каляровай мастацкай кінакарціны «Белыя ночы», створанай кінастудыі «Масфільм» кінарэжысёрам Іванам Пыр'евым, пакладзены твор Дастаеўскага.

«Насрэдзін у Хаджэнце, або зачараваны прынц» — так называецца новая работа таджыкскіх кінематаграфістаў. У фільме папулярны народны герой Хаджа Насрэдзін выступае не толькі як традыцыйны камедыйны персанаж, але і як абаронца народа, які змагаецца за яго вызваленне.

Кінастудыя «Грузія-фільм» выпускае на экраны мастацкую кінааповесць «Майя з Цханеці». Гэта кінаапавяданне аб гераізме прыгонных грузінскай дзяўчыны, якая загінула ў бойцы з ворагам.

Шукальніку праўды і справядлівасці, вядомаму ўкраінскаму філосафу Рыгору Скаварадзе, які ўсё жыццё аддаў барацьбе за шчасце простых людзей, прысвячаецца мастацкі фільм Кіеўскай студыі імя А. П. Даўжэнкі «Рыгор Скаварада».

Мастацкую шырокаэкранную кінааповесць «Усё пачынаецца з дарогі» выпускае студыя «Масфільм». Яна расказвае аб працоўным шчасці будаўнікоў дарог.

Не забыты і наш юны глядач. Для яго будуць дэманстравацца новыя каляровыя мультыплікацыйныя карціны «Тэлефон», «Вяночак песень», «Паўночны дракон», «Манана» і «Сябры - таварышы». Апошні прысвечаны жыццю савецкіх школьнікаў.

Шмат цікавага знойдуць дзеці і ў мастацкай кінакарціне «Першадрукар Іван Фёдараў».

Выйдуць на экран новыя кароткаметражныя фільмы «Жарабя», «Таксама людзі», «Ранішні рэйс» і «Саната Бетховена».

З замежных фільмаў у сакавіку будуць паказаны кітайскія — «Ліст з фронта» і «Лань-Лань і Дун-Дун», карэйскі — «Яе жыццёвы шлях», польскі — «Арол», японскі — «Каханне акцёра», балгарскі — «На маленькім востраве», вытворчасці студыі «Дэфа» (ГДР) — «Працэс адкладваецца» і інш.

К. РАМАНОЎСКІ.

На здымку: кадр з кінафільма «Салдатка».

З агляду калгасна-саўгаснай самадзейнасці

ЗА КУЛІСАМІ

Свае выступаюць. Абцас адарваўся.

Замалёўкі **Л. Чурко.**

На здымку: «Чэшская полька» ў выкананні настаўніцы Пажэжынскай сямігадовай школы Зінаіды **Цвірко** і фельчара Пажэжынскага медпункта Зінаіды **Собаль** (калгас «Шлях да камунізма» Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці).

Фота **Ул. Крука.**

Пам'яті Владислави Францівни Луцевич

Тьотя Владя невтомно збирала
Кожен аркушик, лист і листок,
І з минулых часів прокладала
До нащадків Купали місток.

А тепер — притомилися руки
І на груди зболілі лягли.
Так всі болі, і радощі й муки —
Ви для нього и життя віддали...

Ні печалі, ні болю німого.
Все прожите — живим заповіт.
Тьотю Владю! Ви дивитесь строго:
Лиш Купалин турбує вас світ.

Ви спокійно і тихо спочиньте:
Вічный гомін і сосен, і вод!
І про друга — неспокій покиньте:
Наш Купала — то цілий народ!

Слава тим, що в невтомі кінчали
Шлях життя, що пройшло мов гроза...
Другу нашого друга — Купали —
України прощальна сльоза.

Терень МАСЕНКО.

АПОШНЯЕ БЫВАЙ

Грамадзянская паніхіда, прысвечаная памяці заслужанага дзеяча культуры БССР дырэктара музея Янкі Купалы Уладзіславы Францаўны Луцэвіч, адбылася 27 лютага г. г. у памяшканні Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

У зале, перапоўненай грамадскімі дзеячамі, пісьменнікамі і паэтамі, работнікамі культуры і мастацтва, а таксама прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый, выступілі старшыня пахавальнай камісіі акадэмік АН БССР народны пісьменнік Кандрат Крапіва, ад Саюза пісьменнікаў БССР Міхась Калачынскі, ад акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы народны артыст СССР П. Малчанаў, ад пісьменнікаў Украіны паэт Тарэнь Масэнка, ад калектыву супрацоўнікаў музея Янкі Купалы Яніна Прыбыткова.

З прычыны смерці Уладзіславы Луцэвіч на імя Саюза пісьменнікаў БССР з усіх куткоў СССР паступілі спачувальныя тэлеграмы, у тым ліку ад прэзідыума Саюза савецкіх пісьменнікаў Украіны, праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў Літвы, групы пісьменнікаў Латвійскай ССР. Глыбока смуткуюць пісьменнікі Сяргей Гарадзецкі, Яўген Мазалькоў, выказваюць глыбокі жаль і спачуванне паэт Уладзімір Сасюра, беларускія пісьменнікі, якія знаходзіліся ў гэтыя жалобныя дні за межамі Беларусі — Пятрусь Броўка і Пілін Пестрак і рад іншых таварышаў, знаёмых і блізкіх.

У гэты ж дзень адбылося пахаванне. На магілу Уладзіславы Францаўны былі ўскладзены дзесяткі жалобных вянкоў ад розных арганізацый і ўстаноў.

З развітальным словам над труною Ул. Луцэвіч выступілі акадэмік АН БССР паэт Пятро Глебка і ад ленінградскіх пісьменнікаў Павел Кабзарэўскі.

Мастак-патрыёт

(Да 125-годдзя з дня нараджэння М. О. Мікешына)

Мала хто ведае, што выдатны дзеяч мастацкай культуры другой палавіны XIX ст. Міхаіл Осіпавіч Мікешын—беларус.

Ранняе маленства яго прайшло ў Рослаўлі. Пасля Мікешын неаднаразова наведваў Беларусь. У Магілёўскім павеце, дзе ён спыняўся ў сваякоў, мастак стварыў вялікую серыю эскізаў, якія адлюстроўваюць народныя вобразы і беларускія бытавыя сцэнкі. Частка гэтых эскізаў захоўваецца ў мастацкіх фондах Ленінграда.

Акадэмію мастацтваў Мікешын скончыў у 1858 г. Першыя яго работы былі прысвечаны батальным сцэнам. У іх выявіліся патрыятычныя пачуцці мастака, любоў да простага салдата.

У 1859 г., прымаючы ўдзел у конкурсе на праект помніка тысячагоддзю Расіі, Мікешын атрымаў першую прэмію і заказ на збудаванне ў Ноўгарадзе помніка па сваёй задуме. Праект Мікешына парушыў звычайныя ўяўленні аб манументах, бо вызначаўся размахам і навізною кампазіцыі, свежасцю і жывапіснасцю ў вырашэнні сюжэтных задач.

Асноўным у аўтарскай задуме было імкненне выявіць мастацкімі сродкамі веліч айчыннай гісторыі, паказаць не самадзяржаўную Вялікаросію, а многанацыянальную Расію—адзіную айчыну не толькі рускіх, але ў аднолькавай ступені ўкраінцаў, беларусаў і іншых народаў дзяржавы. Гэта ярка выказана Мікешыным у перапісцы з поваду пабудовы помніка з Аляксандрам II. Дамагаючыся дазволу цара адлюстраваць у помніку Гогаля і Шаўчэнку, Мікешын выступаў выразнікам перадавой рускай грамадскай думкі. Ён любіў Маларосію і кожную выдатную з'яву ў яе літаратуры адносіў да «агульнага гістарычнага ходу развіцця ўсёй нашай айчыны». Работа над помнікам тысячагоддзю Расіі была закончана ў 1862 г.

Пры ўдзеле Мікешына ў гераічным Севастопалі на Малахавым кургане былі ўзведзены помнікі адміралам Карнілаву, Істоміну і Нахімаву. У гэтых помніках Мікешын і яго супрацоўнікі ўзнімаюцца да высокага рэалістычнага абагульнення, набліжаючыся да творчасці перасоўнікаў.

Па праектах Мікешына пабудаваны помнікі і дэкаратыўныя скульптуры ў Лісабоне і радзе гарадоў Сербіі.

Мікешын прымаў удзел у конкурсах на помнікі Глінку для Смаленска (1875) і Пушкіну для Масквы (1880).

У сяле Ванлярова пад Смаленскам захаваўся каменны іканастас, высечаны Мікешыным з валуна для сядзібнай царквы (1874).

Скульптар стварыў многа дэкаратыўных статуэтак, якія адлюстроўваюць гістарычных асоб. Адна з такіх работ—скульптура Пятра I з бронзы—экспануецца цяпер у Дзяржаўным мастацкім музеі БССР. Вобраз Пятра трактаваны рэалістычна, нягледзячы на афіцыйны характар адлюстравання. Пётр паказаны ў момант, калі ён вымаўляе: «тут будзе горад закладзены». Гэты вобраз, створаны Мікешыным, перакліканецца з натхнёным вобразам цара-пераўтваральніка, што належыць мастацкаму генію Пушкіна.

Самы яркі з манументальных твораў Мікешына—помнік Багдану Хмяльніцкаму ў Кіеве (1888). У вобразе Хмяльніцкага дадзены не толькі гістарычна праўдзівы партрэт, у ім абагульнены рысы вялікага палкаводца, вызваліцеля Украіны, народнага героя.

Мікешын імкнуўся паказаць, што дзейнасць Багдана Хмяльніцкага была падтрымана народам, фігурамі прадстаўнікоў якога быў афармлены п'едэстал. Гэты варыянт помніка быў адхілены, бо адміністрацыя Кіева палічыла народныя тыпы тут «не дарэчы»; яны, маўляў, «могуць шкодзіць мастацкаму ўражанню манумента». На шчасце, мадэль помніка захавалася і экспануецца цяпер у Дзяржаўным мастацкім музеі БССР.

На вялікім чатырохгранным пастаменце ўстаноўлена гранітная скала. На першым плане пад яе выступам Мікешын змяшчае фігуру ўкраінскага кабзара, які сядзіць і расказвае пра слаўныя справы Багдана Хмяльніцкага. Задуменна слухаюць народнага песняра рускі і беларус (злева), украінец і галічанін (справа). Гэтыя абагульненыя народныя тыпы павінны былі сімвалізаваць адзінства народаў Расіі, Беларусі, Украіны і Чырвонай Русі, якія складаюць, паводле выразу самога Мікешына, «адзінаплямённую Расію». Змяшчэнне на помніку фігуры бандуриста з'явілася спробай мастака ўвекавечыць вобраз свайго блізкага сябра Т. Шаўчэнкі, неўміручага песняра яднання народаў Расіі.

Помнік Багдану Хмяльніцкаму з'явіўся значным укладам у скарбніцу манументальнай скульптуры, а яго аўтар узвысіўся да ўмелага вырашэння вялікіх ідэйных і рэалістычных задач.

Мікешын вядомы і як рысавальшчык. Асабліва шмат малюнкаў створана ім на тэмы твораў Пушкіна, Гогаля, Шаўчэнкі, Някрасава. Малюнкі Мікешына багатыя па фантастыцы, складаныя па кампазіцыі і дэкаратыўныя па выкананню.

Змястоўныя эскізы Мікешына на разнастайныя народныя тэмы. Большасць з іх прысвечана сялянскаму жыццю, родным пейзажам Смаленшчыны і Беларусі. У іх Мікешын не ўзнімаўся да крытычнага рэалізма, пераважна абмяжоўваючыся вонкавым жывапісным эфектам. Але высокае мастацкае чуццё прымушала яго праўдзіва адлюстроўваць навакольную рэчаіснасць — у гэтым каштоўнасць яго эскізаў, большасць з якіх хвалюе і да гэтага часу.

Дзейнасць М. Мікешына як скульптара і грамадскага дзеяча належным чынам яшчэ не вывучана. Асабліва цікавыя яго патрыятычныя погляды. Ён разглядаў Расію як аб'яднанне раўнапраўных нацый, а буйнейшыя гістарычныя падзеі трактаваў як з'явы глыбока народныя. Ярчэй за ўсё гэтыя філасофскія погляды выяўлены Мікешыным у мастацкай сімволіцы на мадэлі помніка Багдану Хмяльніцкаму.

Беларус па паходжанню, Мікешын да канца жыцця захаваў любоў да роднай зямлі. Калі пачынаецца гаворка пра агульнасць рускай, беларускай і ўкраінскай культур, не выпадкова ўспамінаецца імя Міхаіла Осіпавіча Мікешына, творчасць якога была прысвечана «адзінаплямённай Расіі».

І. БЕЛАГОРЦАЎ.

НАТАТКІ АБ НОВЫХ СПЕКТАКЛЯХ

«Дзядзя Ваня» ў бабруйчан

Чарговую прэм'еру Бабруйскі драматычны тэатр прысвяціў стагоддзю з дня нараджэння Чэхава: паказаў спектакль «Дзядзя Ваня», пастаўлены народным артыстам БССР Д. Арловым.

Поспех у спектаклі выпаў на долю артыста Г. Лаўрова, выканаўцы ролі Астрава. Гэта ён лічыць, што «у чалавеку павінна быць усё цудоўнае: і твар, і адзенне, і душа, і думкі...» Але ўсе яго спробы жыць інакш, чым жывуць навакольныя абывацелі, змагацца супраць бессэнсоўнага знішчэння лесу натыкаюцца на супраціўленне, пераадолець якое яму не ўдаецца.

У ігры Лаўрова каштоўна тое, што яна — роўная, без зрываў і паслаблення тону. Але хочацца асобна адзначыць сцэну прызнання Астрава Алене Андрэеўне (Л. Федчанка). Сцэна гэтая па-майстэрску праведзена як Лаўровым, так і яго партнёркай. Ёсць у адным з маналогаў Астрава такія словы: «Сяляне вельмі аднастайныя, няразвітыя, брудна жывуць...» Калі няправільна зразумець гэтыя словы, а затым няправільна данесці да гледача, дык Астраў прадстане «інтэлігенцкамчысцюлем», які затыкае нос пры ўваходзе ў сялянскую хату. Але ж гэта зусім не стасуецца з сутнасцю героя. Бо калі Астраў, расказваючы пра эпідэмію тыфусу, гаворыць пра цяжкія ўмовы, пра бруд, у якім знаходзяцца хворыя, ён абураецца не на сялян. Гэта ён з вялікім сумам бясконца прыгадвае стрэлачніка, які памёр на аперацыйным стале. Таму прыведзеныя словы, бясспрэчна, сказаны не ў папрок сялянам, а ў дачыненне да таго жыцця, якое так горача ненавідзіць Астраў. Гэта ўсё зразумеў акцёр і (самае важнае!) прымусіў зразумець і гледача.

Нельга не адзначыць работу артысткі К. Смірновай над маленькай роллю нянькі Марыны. Пачуццём такту, нейкай ціхай строгасцю вызначаецца яе ігра. І ў выніку вобраз надоўга запамінаецца.

Вось на сцэне Алена Андрэеўна. Артыстка адкрывае перад гледачом не толькі адмоўныя рысы гераіні. У глыбіні душы Алены Андрэеўны заталася нешта чалавечае, сапраўднае. І вось часам яно прарываецца. Асабліва тонка артыстка паказвае гэта ў сцэне прымірэння з Соняй.

Але трэба ўсё ж зрабіць артыстцы і папрок: у сцэне развітання з Астравым (чацвёрты акт) яна залішне статычная, асабліва ў пачатку.

Добра сыграў ролю Серабракова артыст Н. Міхайлаў. Сцэна Алены і Серабракова ў пачатку другога акта — адно з лепшых месц спектакля.

Гаворачы пра акцёрскія ўдачы, немагчыма абыйсці маўчаннем ігру артыста П. Масцерава ў ролі Цялегіна. Невялікая гэта роля ў п'есе, але ярка створаны вобраз запамінаецца адразу і надоўга. Цяжка было б у чым-небудзь папракнуць акцёра, настолькі бездакорна адточаны ім кожны рух, кожнае слова. І не жаль выклікае яго Цялегін у гледача (так магло б атрымацца пры павярхоўнай ігры), а нейкае агіднае пачуццё, якое бывае, калі сутыкаешся з затхлым, балотным. Гэтае пачуццё асабліва вострае, калі ў фінале спектакля Цялегін паяўляецца моўчкі з гітараю ў руках на сцэне, сядае і наігрывае нудную мелодыю.

Цэнтральная тэма п'есы Чэхава—тэма Вайніцкага, тэма дзядзі Вані. Гэта ён, увогуле чалавек добры, усё сваё жыццё працаваў не пакладаючы рук на Серабракова і толькі ў канцы жыцця заўважыў, што яго кумір аказаўся нікчэмны. У тым, што гэта, нарэшце, зразумета, і заключаецца трагедыя дзядзі Вані. На жаль, выканаўца ролі Вайніцкага А. Аркадзьеў не да канца здолеў паказаць трагедыю дзядзі Вані. У фінале спектакля, калі дзядзя Ваня вяртаецца да ранейшага свайго ладу жыцця, А. Аркадзьеў знаходзіць адпаведныя фарбы для паказу свайго героя, але ў іншых месцах, напрыклад, у важнейшай сцэне з трэцяга акта, акцёру гэта зрабіць не зусім удалося.

Нямала добрага можна сказаць пра ігру артыстак В. Дземянковай у ролі Соні і Т. Бандарчык у ролі Вайніцкай.

Строга і поўнасцю ў стылі п'есы афармлен спектакль мастаком В. Кляшчэўскім. Асабліва ўдалася галінка клёну з пажоўклым лісцем. Яна суправаджае ўвесь спектакль, як сімвал надыходзячай восені.

Глядач яшчэ раз пераканаўся, наколькі плённае супрацоўніцтва тэатра з рэжысёрам Д. Арловым, наколькі ўдзячны зварот да класікі.

Юр. БАТАШОЎ.

Бабруйск.

Не зніжаць патрабавальнасці

Вартасць камедыі А. Сафронава «Кухарка» не толькі ў жыццёвасці сітуацый, у якія трапляюць героі, а, перш за ўсё, у ярка выпісаных драматургам характарах, у сакавітасці мовы. Аўтар знаёмы з побытам кубанскіх калгаснікаў, пра якіх расказвае твор.

У Гомельскім тэатры «Кухарку» паставіў рэжысёр Г. Рэво. Ён вырашыў яе як лірычную камедыю. І гэта правільна. Такая форма вырашэння спектакля арганічна зліваецца з настроямі герояў, цеплынёй пачуцця. Спектакль насычаны музыкай, песнямі, танцамі. Усё зроблена з пачуццём меры, мастацкага такту.

Аформіў спектакль мастак Е. Есафаў. Ён добра перадаў раздолле кубанскага краю—неабсяжныя, залітыя сонцам стэпавыя прасторы. Глядзіш на афармленне і адчуваеш сонечную спякоту, калі паветра калышыцца ад нагрэтай зямлі.

Цяжкую, але вельмі цікавую ролю Паўліны Хутарной выконвае маладая артыстка Л. Прасолава. Паўліна неўтаймаваная і рэзкая жанчына. Яна прайшла цяжкі жыццёвы шлях, рана засталася без бацькоў, жыццё яе многаму навучыла. Але неўтаймаванасць — гэта, хутчэй, зброя абароны, вонкавая абалонка, пад якою б'ецца мяккае, пяшчотнае, поўнае кахання сэрца. Менавіта такою яе і іграе артыстка Прасолава.

Не менш цікавая роля і Галіны Сахно, якую іграе артыстка А. Каменская. Галіна рэзкая і няўрымслівая. Галіна таксама, як і Паўліна, кахае свайго жаніха Серафіма Чайку. Абедзве жанчыны трапляюць прыкладна ў адны і тыя ж сітуацыі. Гэта нібы аб'ядноўвае характары дзвюх гераінь. Аднак Галіна зусім іншая. А. Каменская цікава іграе гэтую ролю. Яе Галіна валявая, нястомная дзяўчына. Яна з песняй ідзе ў поле і радасная вяртаецца дадому. Усё кіпіць у яе руках. Артыстка іграе проста і пераканальна. Асабліва хочацца адзначыць меладычнасць і напеўнасць голасу А. Каменскай у гэтай ролі. Гэта надае нацыянальнае адценне вобразу.

Серафіма Чайку іграе малады здольны акцёр В. Касенка. Вобраз брыгадзіра Чайкі выпісаны аўтарам просталінейна. Чайка не нясе іншых задач, апроч адной: кахання да Галіны. І што датычыць гэтай задачы, дык акцёр, дакладна следуючы ўказанням аўтара, выконвае яе пераканальна і вельмі прывабна. У парадку прапановы хочацца пажадаць рэжысёру спектакля і выканаўцу некалькі ўзбагаціць вобраз Чайкі.

Ролю дэмабілізаванага воіна Сцяпана Казанца выконвае В. Слаўкоў. Гэта добрая акцёрская праца. Глядач верыць у глыбіню яго пачуццяў да Паліны. На жаль, у некаторых сцэнах з каханай дзяўчынай акцёр падмяняе прастату і шчырасць пачуццяў недарэчным пафасам, што, вядома, зніжае мастацкае ўздзеянне вобраза на гледача.

Маладога камбайнера Андрэя Пчолку іграе А. Дударэў. Пра яго хочацца сказаць больш падрабязна. Дударэў у 1957 г. скончыў Мінскі тэатральна-мастацкі інстытут і адразу прыйшоў у Гомельскі абласны тэатр. За два гады ён выканаў рад цікавых ролей. Мы бачылі акцёра і ў іншых спектаклях. Ва ўсіх ролях малады акцёр праўдзівы, просты, шчыры. Да яго ўдач можна аднесці ролю Мішы ў спектаклі «Ён уцякае ад ночы». Акцёр прывабны і ў спектаклі «Кухарка». У ролі Андрэя Пчолкі Дударэў дураслівы, натуральны, вясёлы.

Ёсць у спектаклі даволі арыгінальны персанаж калгаснага вартаўніка Цімафея Слівы. Яго добра іграе акцёр С. Давыдаў. У дзеда Слівы ў спектаклі ўсяго тры выхады. Аднак артыст здолеў стварыць запамінальны вобраз.

Доўгі час тэатр камплектаваў трупу. Цяпер, здаецца, яна ў асноўным укамплектавана здольнай моладдзю. Значыць, ёсць усе падставы да творчага росту. І пры старанным падборы рэпертуару гэтая задача можа быць паспяхова вырашана. Мастацкі савет павінен быць асабліва патрабавальным да п'ес. Чым іншым, як не выпадковасцю, можна вытлумачыць, напрыклад, пастаноўку п'есы В. Гольдфельда «У гэтую ноч ніхто не заснуў»? Чаму гэтая п'еса трапіла ў рэпертуар? На гэтае пытанне ніхто з работнікаў тэатра не мог адказаць.

Да сённяшняга дня ў рэпертуары тэатра няма ніводнай арыгінальнай беларускай п'есы. Гэтая прынцыповая памылка павінна быць неадкладна выпраўлена. Неабходна звязвацца з беларускімі драматургамі і заказваць п'есы для Гомельскага тэатра, не чакаць, пакуль яны з'явяцца на сцэнах рэспубліканскіх тэатраў.

Маладому калектыву хочацца пажадаць паглыбленай работы над вобразамі, творчага росту і прыгадаць акцёрскую ісціну: там, дзе больш цяжкі шлях,—больш адчувальная і перамога.

Ю. СУРЫКАЎ,
рэжысёр Камітэта па радыёвяшчанню і тэлебачанню.

Галоўны рэдактар Янка ШАРАХОЎСКІ.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Мікола ТКАЧОЎ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

Грамадзяне!

КАЛІ ВЫ ПА ЯКІХ-НЕБУДЗЬ ПРЫЧЫНАХ НЕ ВЫПІСВАЕЦЕ ГАЗЕТ І ЧАСОПІСАЎ, АЛЕ ЖАДАЕЦЕ ВЕДАЦЬ, ШТО СЕННЯ НАДРУКАВАНА У НОВЫХ НУМАРАХ ЦЭНТРАЛЬНЫХ І РЭСПУБЛІКАНСКІХ ГАЗЕТ І ЧАСОПІСАЎ, А ТАКСАМА У ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯХ КРАІН НАРОДНАЙ ДЭМАКРАТЫІ, ШТО ВЫДАЮЦЦА НА РУСКАЙ МОВЕ, — НАВЕДВАЙЦЕ ГАЗЕТНА-ЧАСОПІСНЫЯ КІЕСКІ І МАГАЗІНЫ САЮЗДРУКУ.

Тут заўсёды ЕСЦЬ У ПРОДАЖЫ свежыя нумары грамадска-палітычных, сельскагаспадарчых і літаратурна-мастацкіх часопісаў, а таксама выданняў краін народнай дэмакратыі.

САЮЗДРУК
Міністэрства сувязі БССР.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі—3-24-61, адказнага сакратара і аддзела літаратуры—3-25-25, аддзела мастацтва—3-24-62, аддзела культуры—3-21-53, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у сераду і суботу.

АТ 02154

Друкарня імя Сталіна